МЭТА ПАРТЫІ—ШЧАСЦЕ ЧАЛАВЕКА

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 61 (1595) | Пятніца, 4 жніўня 1961 года | Цана 4 кап.

Ва ўмовах пераходу да камунізма творчая дзейнасць ва ўсіх галінах культуры становіцца асабліва плённай і даступнай для ўсіх членаў грамадства. Савецкая літаратура, музыка, жывапіс, кінематаграфія, тэатр, усе галіны мастацтва дасягнуць новых вышынь у развіцці ідэйнага зместу і мастацкага майстэрства.

З ПРАЕКТА ПРАГРАМЫ КПСС

РОЗУМ, ГОНАР І СУМЛЕННЕ ЭПОХІ

Казімір БУСЛАЎ,

кандыдат філасофскіх навук

Камуністычная партыя Савецкага Саюза — найвялікшая палітычная і ідэйная сіла сучаснасці. Усё сапраўды вялікае і гераічнае, што адбываецца ў нашу эпоху, увасоблена ў яе шматгранній тытанічнай дзейнасці. Высакародныя ідэі барацьбы за рэвалюцыйную перабудову грамадства адлюстраваны ў яе назве — Камуністычная партыя. «Назва нашай партыі дастаткова ясна выражае, што мы ідзём да поўнага камунізма...» — гаварыў Ул. І. Ленін.

Велічыня, сіла ўплыву, аўтарытэт кожнай палітычнай партыі вымяраецца велічынёй і цяжкасцю той задачы, якую яна выконвае. Няма і не было ў гісторыі такой партыі, якая б прысвяціла сваю дзейнасць змяненню грамадскага ладу ў імя шчасця чалавека працы, у імя ўсяго чалавецтва. Гісторыя таксама не ведае і такой партыі, якая б узяла на сябе смеласць ад імя ўсяго народа і пры яго поўнай падтрымцы заявіць аб выкананні сваёй праграмы. Выступіўшы перад усім светам як вялікая пераўтваральная сіла, наша партыя выканала сваю першую і другую праграмы менш, чым за 60 год, пра што ўрачыста і паведаміла ўсім людзям на зямлі.

У першай Праграме асноўная задача партыі заключалася ў звяржэнні капіталізму і ўстанаўленні дыктатуры пралетарыята. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі пралетарыят нашай краіны ў саюзе з сялянствам уладарнай рукой узняў Чырвоны сцяг Кастрычніка, нанёс рашаючы ўдар па імперыялістычнай сістэме, і на карце свету ўзнікла Краіна Саветаў. Змянілася плынь сусветнай гісторыі.

Крыніца невычэрпнай жыццесцвярджальнай сілы Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі — у яе сапраўды, народным характары. Яе велізарны ўплыў на сацыяльны прагрэс заключаецца ў тым, што яна ўзняла да свабоды, да самастойнай працы шырокія масы працоўных і што дзякуючы ім і пры непасрэдным іх удзеле пачата шырока задуманая сістэма сацыялістычных пераўтварэнняў.

У другой Праграме партыі была пастаўлена задача пабудовы сацыялістычнага грамадства. Ул. І. Ленін ад імя партыі гаварыў, што мы Расію пераканалі, мы Расію адваявалі ад эксплуататараў для працоўных, мы эксплуататараў перамаглі — мы павінны навучыцца Расіяй кіраваць. Трэба было знайсці ў шматнацыянальнай, эканамічна адсталай і непісьменнай краіне людзей і сродкі для стварэння такога сацыяльнага ладу, які адпавядаў бы інтарэсам працоўных і ў той жа час быў практычна здзяйсняльным. Камуністычнай партыі, як авангарду рабочага класа, непатрэбны праграмы, якія ашукваюць народ нездзяйсняльнымі абяцаннямі. У складанейшых умовах, калі крута мяняўся ход гістарычных падзей, партыя знаходзіла правільныя адказы народу і ўпэўнена вяла краіну па курсу, вызначаным вялікім Леніным.

Сацыялізм, пра нездзяйсняльнасць якога трубілі і трубяць ідэолагі буржуазіі, цалкам і канчаткова перамог у нашай краіне і трывала ўсталяваўся як сусветная сістэма. Ён аказвае магутнае ўздзеянне на ўвесь ход сусветнай гісторыі.

Партыя выконвала папярэднія праграмы ў абстаноўцы жорсткай барацьбы з ворагамі марксізма як у галіне тэорыі, так і ў галіне практыкі. Пад кіраўніцтвам Леніна, а пасля яго смерці кіруючыся яго запаветамі, яна паспяхова адбіла напады ўнутраных ворагаў і міжнароднага імперыялізму.

Дзе ж тая ўсеперамагальная крыніца сілы нашай партыі, дзякуючы якой дасягнуты перамогі сусветна-гістарычнага значэння, забяспечана выкананне намечаных праграм, велічных па сваіх мэтах і размаху, найвялікшых па свайму ўплыву на далейшае развіццё чалавечага грамадства?

Сіла Камуністычнай партыі закладзена ў гістарычнай перспектыўнасці рабочага класа, у яго сацыяльнай трываласці. Вядома, што занепад класа буржуазіі абумоўлівае і разлажэнне яе партый, закліканых захаваць панаванне капіталу. Наша партыя, якая ўвабрала ў сябе невычэрпную энергію самага паслядоўнага ў рэвалюцыйнай барацьбе класа, такая ж моцная і маналітная, як і рабочы клас, за ідэалы якога яна змагаецца.

З'яўляючыся вышэйшай формай класавай арганізацыі, Камуністычная партыя ва ўсёй сваёй дзейнасці абапіраецца на масы. Наша партыя аказалася непераможнай іменна таму, што яна, як указваў Ленін, здолела звязацца, зблізіцца, да пэўнай ступені «зліцца з самай шырокай масай працоўных».

Гістарычна перамагае тая партыя, якая можа весці за сабой шырокія масы працоўнага народа і адначасова вучыцца ў яго. Наша партыя эканамічна, палітычна, духоўна выказвае сапраўдныя інтарэсы пераважнай большасці працоўных. Ганаровую ролю кіруючай сілы ў сучасным грамадстве марксісцка-ленінская партыя забяспечвае сабе тым, што яна поўнасцю выражае думкі народа.

Усе папярэднія грамадствы ўтвараліся стыхійна. Сацыялізм і камунізм будуюцца свядома і планамерна, і гэта абумоўлівае нябачаную ролю кіраўніка, арганізатара і натхняльніка працоўных — Камуністычнай партыі. Савецкае грамадства грунтуецца на строга навуковых прынцыпах. Навуковае кіраўніцтва грамадствам — адно з галоўных прызначэнняў партыі. Ленінізм з'яўляецца вялікай навуковай і ідэйнай зброяй партыі.

Класікі марксізма-ленінізма, стварыўшы навуковы светапогляд рабочага класа і яго партыі, вучылі, што іх навука — не догма, а кіраўніцтва да пазнання і рэвалюцыйнага пераўтварэння старога свету. Грунтуючыся на палажэннях Маркса, Энгельса, Леніна, абагульняючы вопыт барацьбы за дыктатуру пралетарыята, вопыт будаўніцтва сацыялізма ў СССР, Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза развіваў і развівае рэвалюцыйную тэорыю, навуку аб камуністычным грамадстве, звяртаючы асаблівую ўвагу на тое палажэнне, што законы гісторыі праяўляюцца ў дзеяннях мас, дзеяннях, якія выклікаюцца матэрыяльнымі ўмовамі іх жыцця. У многіх дакументах КПСС, прысвечаных аналізу капіталістычнага грамадства, будаўніцтву сацыялізма і камунізма, міжнароднаму рабочаму руху, дадзены тэарэтычныя абагульненні па праблемах эканомікі, філасофіі, гісторыі, стратэгіі і тактыкі партыі, якія з'яўляюцца вялікім укладам у развіццё марксісцка-ленінскай навукі.

Адзінства тэорыі і практыкі — непарушная аснова і крыніца поспеху дзейнасці нашай партыі. Вырашэнне вялікіх практычных задач з'яўляецца адначасова і вырашэннем вялікіх тэарэтычных пытанняў. Тэорыя марксізма-ленінізма развівалася і развіваецца ў непарыўнай сувязі з практычнай барацьбой за дыктатуру пралетарыята, за камунізм. Тэорыя знітавалася з практыкай сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва. Практыка апладатварае тэорыю, з'яўляецца асновай яе далейшага развіцця. Тэорыя вучыць разуменню гіс-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ЗАПАВЕТНЫЯ МАРЫ ЛЮДЗЕЙ

Самыя лепшыя, самыя дарагія мары ўвабраў у сябе праект Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Гэты натхнёны, яркі гістарычны дакумент, створаны геніем і мудрасцю нашай партыі, акрыляе, радуе, захапляе. Перад намі рэальны, вызначаны з навуковай кангрэтнасцю, шлях у камуністычнае грамадства. «Цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме!» — ад усведамлення гэтага маладзееш, адчуваеш прыліў новых сіл. І хочацца жыць, жыць і тварыць для народа, аддаць усяго сябе, каб красавала наша старая планета Зямля. Ніхто не можа спыніць пераможны поступ камунізма. Смяротна хворы капіталізм памірае і ён памрэ. Нельга засланіць сонца, а вялікая праўда партыі, як сонца, узнімаецца над светам. Мір, Праца, Свабода, Роўнасць і Шчасце ўсіх народаў — не калі-небудзь у далёкай будучыні, а блізка, перад намі.

А росквіт літаратуры і мастацтва! А магчымасць кожнаму праявіць свае здольнасці! Сапраўды, няма межаў удасканалення чалавека. Сёння ў нас яшчэ сям-там ёсць і ліхое, ёсць зло. І партыя заклікае нас знішчыць гэтае зло, выкарчаваць усё, што перашкаджае вялікай мэце пабудовы камуністычнага грамадства.

Кожны, відаць, азіраючыся на сваё мінулае, пытае сам сябе: «А ці добра ты жыў, ці ўсё зрабіў для свайго народа, для краіны?».

Задача працаўнікоў літаратуры і мастацтва пачэсная і вельмі адказная. Ідэалагічны фронт — адзін з самых складаных, і нам, работнікам мастацтва, трэба працаваць, не шкадуючы сіл і таленту.

Тэатр, як школа камуністычнага выхавання, набывае асаблівае значэнне. Выхаванне чалавека гарманічнага па ўсіх адносінах — гэта адна з пачэсных, хоць і нялёгкіх задач. Тэатр павінен быць у першых радах змагароў за камунізм. Талентаў у народзе незлічона, і каб яны развіваліся і квітнелі, патрэбен прастор, і гэты прастор дае нам праект новай Праграмы Камуністычнай партыі.

Будзем жыць і тварыць для шчасця чалавецтва!

П. МАЛЧАНАЎ,
Б. ПЛАТОНАЎ,
Ул. УЛАДАМІРСКІ,
народныя артысты СССР.

У гарадах і вёсках рэспублікі праходзяць калектыўныя чытанні праекта Праграмы КПСС. Рабочыя, калгаснікі і працоўная інтэлігенцыя Беларусі горача абмяркоўваюць важнейшы дакумент роднай партыі. На здымку вы бачыце чытанне праекта Праграмы КПСС у Саюзе мастакоў БССР.

Фота Ул. Крука.

Патрабаванне часу

Па савецкай зямлі ўпэўненай хадой крочыць сямігодка. Радуюць сваімі поспехамі і рабочыя прадпрыемстваў і працаўнікі вёскі. І на фронце культуры ёсць немалыя здабыткі.

Узяць хоць бы наш Бабруйск. За апошні час двум драматычным самадзейным калектывам прысвоена званне народных тэатраў. Відавочныя творчыя поспехі і ў драматычных калектываў фанера-дрэваапрацоўчага камбіната, швейнай фабрыкі імя Дзяржынскага, раённага Дома культуры, Дома настаўнікаў і некаторых іншых. А вось другі прыклад. У нашым горадзе на многіх прадпрыемствах адкрыты свае музычныя школы.

Пры гарадскім партыйным кабінеце, у калгасе «Перамога» і саўгасе «Бабруйскі», на многіх прадпрыемствах горада працуюць універсітэты культуры, якія наведваюць некалькі тысяч бабруйчан.

Народныя універсітэты культуры заваявалі шырокую папулярнасць у працоўных. Вось чаму трэба, каб кожная лекцыя, што чытаецца тут, была змястоўнай і цікавай. На вялікі жаль, мала яшчэ ў нас вопытных лектараў па пытаннях літаратуры і мастацтва. У гэтым, відаць, вінаваты нашы творчыя саюзы — кампазітараў, мастакоў, пісьменнікаў, кінематаграфістаў і журналістаў, а таксама Тэатральнае таварыства. І сёння яшчэ вопытны знаўца мастацтва — рэдкі госць у сельскім універсітэце культуры. У час, калі ставіцца задача аб ліквідацыі розніцы паміж горадам і вёскай, трэба значна больш увагі аддаваць шырокаму паходу дзеячоў літаратуры і мастацтва за ўздым культуры працаўнікоў калгасаў і саўгасаў.

Творчая сувязь самадзейнага мастацтва з прафесіянальным дае ўжо сёння плённыя вынікі. Узяць, напрыклад, наш тэатр. Толькі за апошні год у наш калектыў прыйшлі з мастацкай самадзейнасці і сталі прафесіянальнымі артыстамі Л. Бараноўская, В. Багачоў, Б. Чыркоўскі, Л. Жужома, Э. Дзераўцова і іншыя. Маладыя акцёры складаюць цяпер трэцюю частку нашай трупы.

У праекце Праграмы партыі адзначаецца, што тэатральнае мастацтва павінна стаць здабыткам кожнага працаўніка, дзе б ён ні жыў — ці ў горадзе, ці на вёсцы. У сувязі з гэтым хочацца выказаць некалькі прапаноў. Добра, што цяпер большасць тэатраў нашай рэспублікі часцей стала выязджаць на вёску. Але ўсё ж абслугоўванне тэатрам сельскага гледача яшчэ адстае ад горада. Наш перасоўны тэатр больш за ўсё выступае ў калгасах і саўгасах, наведвае самыя далёкія куткі рэспублікі. У нас ёсць яшчэ многа такіх вёсак і нават раённых цэнтраў, дзе на працягу раду год не было ні тэатраў, ні эстрадных груп. Адзін перасоўны тэатр, без належнай падтрымкі іншых творчых калектываў рэспублікі, ніколі не здолее вырашыць праблему абслугоўвання сельскага гледача. Мне думаецца, што ў новым сезоне нашым тэатрам варта так спланаваць сваю работу, каб трэцюю частку агульнай колькасці спектакляў яны ставілі на вёсцы. Карысна больш шырока выкарыстоўваць студэнтаў музычных вучылішчаў, кансерваторыі, тэатральнага інстытута, а таксама найбольш таленавітых удзельнікаў самадзейнасці. Няхай бы з ліку гэтай творчай моладзі Беларускай філармонія стварыла часовыя эстрадныя групы для выездаў з канцэртамі ў калгасы і саўгасы.

Час ужо дамагчыся, каб у бліжэйшыя два-тры гады ўсе раёныя дамы культуры рэспублікі, а таксама некаторыя буйныя калгасы і саўгасы мелі свае народныя тэатры. А недахопу ў таленавітых людзях у нас няма. Трэба толькі іх своечасова выяўляць і дапамагаць ім у творчым росце. Справу гэтую можна было б арганізаваць значна шырэй, але пакуль што не хапае ў нас рэжысёраў. Таму, магчыма, варта пашырыць прыём у наш тэатральны інстытут з тым, каб ён рыхтаваў спецыялістаў і для народных тэатраў.

Хочацца верыць, што пасля азнаямлення з праектам Праграмы нашай партыі сёй-той з вопытных акцёраў і рэжысёраў-прафесіяналаў праявіць высакародны пачын — выкажа жаданне на пэўны час паехаць у раёны для аказання практычнай дапамогі народным тэатрам.

Нашы прафесіянальныя і народныя тэатры, шматлікая армія драмгурткоўцаў адчуваюць вялікую патрэбу ў рэпертуары на сучасную тэму. На жаль, мы не можам сёння сказаць, што ёсць у нас добрая п'еса, у якой бы быў створаны запамінальны вобраз камуніста, актыўнага будаўніка новага грамадства.

Барацьба за высокую камуністычную свядомасць савецкага чалавека з'яўляецца важнейшым абавязкам работнікаў культурнага фронта. І гэтую задачу трэба паспяхова вырашыць.

П. КАПЯЛЮШНЫ,
дырэктар Бабруйскага драматычнага тэатра.

БУДУЕМ І ПАБУДУЕМ!

Кожны год прыносіць нашаму народу ўсё новыя і новыя перамогі. Аднак гэты, 1961 — незвычайны год. Ён увогуле ўдаўся такім, што назаўсёды запомніцца чалавецтву. Хіба толькі з цэлай эпохай можна параўнаць гэты год. Яшчэ нядаўна, упершыню ў гісторыі чалавецтва, савецкі грамадзянін Юрый Гагарын узляцеў высока над планетай, і вось ужо адкрыліся новыя вышыні: для ўсенароднага абмеркавання апублікаваны праект новай Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза — праграмы будаўніцтва камунізма.

Нельга не хваляваццa, калі чытаеш пра тыя грандыёзныя планы вялікага будаўніцтва, якія намечаны ў праекце Праграмы. Пройдзе дваццаць год, і перад нашым народам паўстане явай тое светлае і радаснае жыццё, за якое змагаліся пакаленні, якое мы ў мастацкіх творах называем светлым Заўтра.

Вялікія задачы вызначыла партыя і для літаратуры і мастацтва. Стаяць бліжэй да жыцця, быць усюды і заўсёды з народам, адлюстроўваць тыя велічныя зрухі, што адбываюцца ў нашай краіне, ва ўсёй велічы паказаць новага чалавека свету — будаўніка камунізма.

За дваццаць год зрабіць такі гіганцкі крок наперад, які вызначаны ў праекце Праграмы, здолеем толькі наш народ, натхнёны партыяй на вялікія подзвігі. Партыя кліча нас наперад, да новых вышынь. Слава табе, вялікая партыя Леніна! Ты прынесла савецкаму народу цудоўнае жыццё і клічаш народ да яшчэ лепшага. Хочацца жыць і працаваць, аддаць усе свае сілы і здольнасці роднай партыі, роднаму народу, роднай краіне. Хай квітнее яна прыгожаю кветкай на ўвесь свет, хай кліча ўсё чалавецтва да той светлай явы, якую мы будуем і абавязкова пабудуем.

Рыгор НЯХАЙ.

СЭРЦА МАЛАДЗЕЕ

Смелыя дзярзанні і велічныя здзяйсненні — не навіна ў жыцці нашага народа. Але тое, што адбываецца цяпер у савецкім грамадстве — цудоўна!

Чытаючы праект Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, адчуваеш выключны ўздым творчай энергіі. Яна выклікае столькі новых думак і хвалюючых эмоцый, што аж дух займае.

Велізарную перспектыву раскрывае перад кожным з нас раздзел праекта Праграмы, прысвечаны культурнаму жыццю будаўнікоў камунізма, задачам майстрой мастацтва.

«Галоўная лінія ў развіцці літаратуры і мастацтва, — сказана ў праекце, — умацаванне сувязей з жыццём народа, праўдзівае і высокамастацкае адлюстраванне багацця і мнагастайнасці сацыялістычнай рэчаіснасці, натхнёны і яркі паказ новага сапраўды камуністычнага, і выкрыццё ўсяго таго, што перашкаджае руху грамадства наперад».

Здаецца, партыя зазірнула ў сэрца кожнага дзеяча мастацтва, і выказала тое, што найбольш хвалюе і акрыляе нас.

Мы зробім усё для таго, каб савецкае мастацтва дасягнула новых вышынь у развіцці ідэйнага зместу і мастацкага майстэрства.

А. БЕМБЕЛЬ,
народны мастак БССР.

ІДЗЕ, ТАВАРЫШЫ, КАМУНА!..

У Янкі Купалы ёсць цудоўны верш «На смерць Сцяпана Булата». Многія тысячы чытачоў звярталі ўвагу на тое, што ў ім паэт у самым пачатку дваццатых гадоў з надзвычайнай шчырасцю і цеплынёй выказаў мару аб светлай камуністычнай будучыні беларускага народа. Прытым камуністычная будучыня выглядае як не такая ўжо далёкая рэчаіснасць. У вершы адчуваецца ўпэўненасць, што ў савецкай краіне, у родным краі будзе пабудаваны камунізм. Паэт гаварыў:

Забуяе ў славе буйнай,
Зазвініць залатаструнне
Родны Край адной Камунай...
— Сні, таварыш, аб Камуне!

Калі я чытаў праект Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, дык гэтыя радкі неяк самі сабой прыйшлі на памяць. Можа, таму, што з'явіліся яны дзесьці там, у пачатку гераічнай эпохі, праз некалькі год пасля перамогі Вялікага Кастрычніка. Можа, і таму, што ў гэтай купалаўскай мары аб камунізме ўвасобіліся думы і спадзяванні народныя, што і сама гэтая мара нарадзілася ад сыноўняга давер'я і прыхільнасці да ідэй і справы партыі.

Іменна ў такіх вершах зарука і пачатак той натхнёнай акрылёнасці, якая спадарожнічала паэту ў яго пачэсным паходзе разам з савецкім народам, яшчэ нікім не пратораным, але вельмі заваблівым шляхам сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэта тая самая акрылёнасць, якую ва ўсіх нас заўсёды падтрымлівала партыя. У розныя часы акрылёнасць гэтая называлася па-рознаму — ліквідацыяй разрухі і індустрыялізацыяй, выкананнем пяцігодак і ўдарніцтвам, разгромам ворага і пасляваенным будаўніцтвам, сямігодкай, узняццем цаліны, камуністычнымі брыгадамі. А сутнасць была адна: няўхільны поступ да зззяючых вяршынь камунізма!

Ад першага дня Кастрычніцкай перамогі цягнуцца залатыя ніці той трывалай асновы, па якой ткалася наша цудоўная ява. І цяпер, пасля апублікавання праекта Праграмы партыі, асабліва яскрава адчулася, як многа зроблена. Прыемна ўсведамляць, што і кожны з нас быў удзельнікам настойлівай працы ўсяго народа.

У праекце Праграмы запісаны блізкія і зразумелыя ўсім словы — суіснаванне, мір, дружба народаў! Мы, камуністы, хочам назаўсёды пакончыць з чалавеканенавісніцтвам, з бессэнсоўным вынішчэннем мільёнаў людзей. Хопіць усім месца пад сонцам, хопіць і рэсурсаў, і не толькі на сённяшні дзень, але і ў далёкай будучыні, калі чалавецтва вунь як разрасцецца. Трэба толькі разумна, па-камуністычнаму арганізаваць грамадства, арганізаваць вытворчасць усіх жыццёвых багаццяў.

У праекце новай Праграмы абвешчана ўсебаковае далейшае развіццё культуры, мастацтва, літаратуры. Калі людзі стануць жыць больш забяспечана і будуць мець больш вольнага часу, дык у іх з'явяцца проста нябачаныя раней магчымасці для развіцця навукі і розных галін мастацкай дзейнасці. Гэта радуе нас да глыбіні душы і за сябе, і асабліва за нашых дзяцей і ўнукаў.

І самае галоўнае: у праекце Праграмы пастаўлена задача дасягнення такога дабрабыту для ўсяго народа, аб якім калісьці можна было толькі марыць. У гэтым найвялікшая моц праекта новай Праграмы. На працягу стагоддзяў чалавецтва марыла аб шчаслівым жыцці для ўсіх. І тут раптам сказана, што цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме. За такую Праграму аднадушна прагаласуюць усе савецкія людзі і сумленныя людзі ўсёй зямлі.

І хочацца закончыць натхнёнымі словамі Янкі Купалы:

З Масквы, з Крамля, хадою ўдумнай,
Усенароднай, чалавечай,
Праз поле, поплавы, буруны
Ідзе, таварышы, Камуна
На свеце шчасце ўвекавечыць!

Янка ШАРАХОЎСКІ.

ТВАЙМУ З'ЕЗДУ, ПАРТЫЯ!

«Кніжныя скарбы — народу!» — пад такім дэвізам у Мінскай вобласці праходзіць па трох маршрутах эстафета бібліятэк, прысвечаная XXII з'езду КПСС.

Па маршруту № 2 эстафета выйшла з Маладзечна ў Івянец. Днямі яна прыйшла ў Валожын. Тут прапагандысты літаратуры ў спецыяльнай кнізе рапартаў працоўных перамог запісалі: «Табе, родная партыя, твайму з'езду мы рапартуем сёння аб сваіх справах, табе прысвячаем сваю працу!» На Валожыншчыне працуе 117 перасовак літаратуры ад раённых і сельскіх бібліятэк, 23 пункты выдачы кніг. Звыш 50 чытачоў з'яўляюцца грамадскімі бібліятэкарамі. Фельчарка раённай бальніцы Надзя Гармаш (на здымку злева) працуе грамадскім прапагандыстам кнігі. Яна прыйшла да работніцы раённай бібліятэкі Веры Лебедзевай за новай літаратурай. Дзяўчаты вельмі чула ставяцца да заказаў сваіх чытачоў. Надзя Гармаш выбірае літаратуру для вітрыны кніг, прысвечанай XXII з'езду партыі.

З Валожына эстафета пойдзе па маршруту Вілейка — Крывічы — Плешчаніцы — Лагойск. Напярэдадні адкрыцця XXII з'езда КПСС эстафета прыйдзе ў Мінск. Яна даставіць сюды кнігу, у якой бібліятэчныя работнікі вобласці будуць рапартаваць роднай партыі аб сваіх працоўных поспехах.

У гэтыя дні ў сельскагаспадарчых арцелях Валожынскага раёна прапагандысты кнігі знаёмяць калгаснікаў з праектам новай Праграмы КПСС. На гэтую тэму праводзяцца гутаркі, арганізоўваюцца літаратурныя выстаўкі.

— Наша родная партыя заўсёды клапоціцца аб дабрабыце свайго народа, аб росквіце ўсіх галін культуры, — сказала бібліятэкарка Вера Лебедзева. — Усе нашы чытачы адабраюць праект велічнай Праграмы КПСС.

Фота і тэкст А. Махнача.

Члены сельгасарцелі «Савецкая Беларусь» Мінскага раёна знаёмяцца з праектам Праграмы КПСС.

Фота В. Волгіна.

РОЗУМ, ГОНАР І СУМЛЕННЕ ЭПОХІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

тарычнай непазбежнасці перамогі пралетарыята над капіталізмам, над рэакцыяй.

Сіла партыі ў тым, што яна заўсёды ідзе ў нагу з жыццём. Яна на кожным новым гістарычным этапе ўмее знайсці тое галоўнае звяно, ухапіўшыся за якое, можна паспяхова вырашыць задачы, што стаяць перад краінаю. Кіруючыся ленінскім вучэннем, партыя своечасова вызначае надзённыя пытанні развіцця грамадства і накіроўвае ўсе сілы народа на іх ажыццяўленне.

Буйныя мерапрыемствы гаспадарчага, арганізацыйнага і палітычнага характару, якія ажыццяўляе партыя, гавораць аб тым, што ўся яе дзейнасць падпарадкавана вырашэнню надзённых праблем жыцця народа. Праграма партыі, вучыць Ленін, не можа заставацца толькі праграмай. Яна павінна ператварыцца ў праграму гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. «Мы цэнім камунізм толькі тады, — гаварыў Ул. І. Ленін, — калі ён абгрунтаваны эканамічна».

Выдатным узорам творчага падыходу да вырашэння надзённых пытанняў грамадскага развіцця з'яўляецца работа Цэнтральнага Камітэта і ўсёй партыі па ліквідацыі ўзнікшай неадпаведнасці паміж развіццём прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў пачатку 50-х гг. Меры, прынятыя партыяй па крутому ўздыму сельскай гаспадаркі, перабудова кіраўніцтва прамысловасцю і будаўніцтвам, пашырэнне правоў саюзных рэспублік, рэарганізацыя МТС і далейшае ўмацаванне калгаснага ладу, паспяховае развіццё хімічнай прамысловасці, барацьба за тэхнічны прагрэс, удасканаленне народнай асветы — усё гэта адыграла вялікую ролю ў руху нашай краіны па шляху да камунізма.

Сямігадовы план, распрацаваны ў поўнай адпаведнасці з аб'ектыўнымі эканамічнымі законамі, з'яўляецца выражэннем ленінскай генеральнай лініі партыі ва ўмовах пераходу краіны ад сацыялізма да камунізма. Знайшло сваё выражэнне навуковае прадбачанне, якім валодае наша партыя. Глыбокая празорлівасць партыі сказалася ў тым, што яна нацэліла народы краіны на паскарэнне тэмпаў будаўніцтва новага грамадства.

У гісторыі яшчэ не было такога прыкладу вялікіх клопатаў аб народзе, якія праяўляе наша партыя. Няўхільнае павышэнне матэрыяльнага дабрабыту народа — вышэйшы закон усёй дзейнасці партыі, састаўная частка яе праграмы.

Здзіўляючы ўвесь свет кіпучай дзейнасцю па кіраўніцтву камуністычным будаўніцтвам, Цэнтральны Камітэт КПСС заўсёды вызначаецца практычнай пастаноўкай надзённых пытанняў грамадскага развіцця, заснаваных на навуковых прынцыпах. Творчы розум партыі, яго навуковая глыбіня і практычная гнуткасць, празорлівасць і рэальнасць знайшлі сваё ўвасабленне ў праекце трэцяй Праграмы — праграмы пабудовы камуністычнага грамадства, закліканага выканаць гістарычную місію пазбаўлення людзей ад сацыяльнай няроўнасці, ад усіх форм прыгнечання і эксплуатацыі, ад жахаў вайны і ўсталяваць на зямлі Мір, Працу, Свабоду, Роўнасць і Шчасце ўсіх народаў.

У жыцці народаў свету не было падзеі, якая па свайму ўплыву на гістарычны лёс чалавецтва магла б параўнацца з велічным планам пабудовы камунізма, распрацаваным у праекце Праграмы. Развіваючы марксізм-ленінізм у новых умовах, партыя зыходзіць з таго, што пры пераходзе ад сацыялізма да камунізма ўзнікаюць новыя грамадскія заканамернасці. У праекце Праграмы асаблівае месца аддадзена свядомай дзейнасці народных мас, гаворыцца пра ўзрастанне кіруючай ролі Камуністычнай партыі. Гістарычны вопыт барацьбы за сацыялізм паказвае, што ў працэсе будаўніцтва камуністычнага грамадства роля партыі надзвычай павялічваецца. «Увесь вопыт барацьбы за перамогу сацыялізма і камунізма ў нашай краіне і ў іншых сацыялістычных краінах, — гаварыў М. С. Хрушчоў, — пацвярджае правільнасць аднаго з важнейшых палажэнняў ленінізма аб тым, што ў працэсе будаўніцтва камуністычнага грамадства роля партыі павінна ўзрастаць, а не паслаблядца, як гэта сцвярджаюць сучасныя рэвізіяністы».

Шырокае і шматграннае кола як тэарэтычных, так і практычных пытанняў, якія належыць вырашаць партыі ў новых гістарычных умовах. Партыя кіруе ўсімі галінамі жыцця. Абагульняючы вопыт барацьбы мас за камунізм, партыя дапамагае народу разумець заканамернасці рэчаіснасці, усвядоміць мэты стваральнай працы і больш упэўнена ісці па намечаным шляху.

У праекце Праграмы знайшлі глыбокае тэарэтычнае абгрунтаванне карэнныя пытанні камуністычнага будаўніцтва — аб матэрыяльна-тэхнічнай базе камунізма, аб размеркаванні матэрыяльных даброт ва ўмовах камунізма, аб шляхах развіцця і збліжэння калектыўнай і грамадскай форм уласнасці, аб палітычнай арганізацыі грамадства, аб задачах партыі ў галіне нацыянальных адносін, у галіне ідэалогіі, выхавання, адукацыі, навукі і культуры, аб развіцці сусветнай сацыялістычнай сістэмы і інш. Усебаковае і глыбокае асвятленне ўзнятых праблем у адпаведнасці з ператваральнай практыкай народа з'яўляецца новым буйным укладам у марксісцка-ленінскую тэорыю.

Камунізм і народ зліліся ў нашай краіне ў адну магутную сілу. Упершыню ў гісторыі чалавецтва навуковы светапогляд з'яўляецца кіраўніцтвам для соцень мільёнаў працоўных у жыцці, працы, быце.

Камунізм з'яўляецца навуковай арганізацыяй грамадства. У праекце Праграмы падкрэсліваецца, што стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, дасягненне багацця матэрыяльных даброт, пераход да грамадскага самакіравання знаходзіцца ў простай залежнасці ад павышэння ўзроўню свядомасці мас. Будаўніцтва камунізма патрабуе канчатковага пераадолення перажыткаў мінулага ў свядомасці людзей, фармавання шматграннай асобы чалавека, развіцця новых рыс характару, высокай маралі і гуманізму. Вялікая ўвага аддаецца ў праекце Праграмы працоўнаму выхаванню, развіццю ідэйных, маральных стымулаў да працы для шчасця грамадства.

Будаўніцтва камунізма ажыццяўляецца ва ўмовах складанага міжнароднага становішча, ва ўмовах абвастрэння барацьбы паміж лагерам сацыялізма і лагерам імперыялізму, у галіне эканомікі, палітыкі, ідэалогіі. Творы Ул. І. Леніна, рашэнні партыі, а таксама праект Праграмы — узор барацьбы за чысціню марксісцка-ленінскай тэорыі, за адзінства радоў партыі. Выконваючы запаветы Ул. І. Леніна, партыя выкрыла погляды і практыку сучасных рэвізіяністаў, замаскіраваных ворагаў сацыялізма, лазутчыкаў імперыялістычнага лагера.

Нашу партыю любяць і паважаюць народы свету — у гэтым яе непераможная сіла. Барацьба нашай партыі за мір, яе вучэнне аб непазбежным краху ганебнай каланіяльнай сістэмы, новае вырашэнне праблемы міру і сацыялізма, якое атрымала глыбокае асвятленне ў выступленнях М. С. Хрушчова, а таксама ў праекце Праграмы, адпавядаюць спадзяванням народаў зямнога шара. Разам з савецкім народам працоўныя ўсіх краін свету выказваюць падзяку мудрай партыі, пра якую так добра сказаў Ленін, што яна — «розум, гонар і сумленне нашай эпохі».

Нават ворагі, ненавідзячы, вымушаны прызнаць сілу і мудрасць нашай партыі. Амерыканскі сацыёлаг Габрыель Олмэнд у сваёй кнізе «Прыцягальныя лозунгі камунізма», поўнай брудных выдумак пра камуністычныя партыі, вымушаны ўсё ж гаварыць, што «рэвалюцыйныя змагары марксізма» былі «навуковымі спецыялістамі», якія ведалі законы гісторыі і сацыяльнага прагрэсу, што яны, з'яўляючыся «будаўнікамі новага чалавечага грамадства», — «добрыя арганізатары і тактыкі», «адданы інтэрнацыянальнаму пралетарыяту».

Пад мудрым кіраўніцтвам ленінскай партыі ідэі навуковага камунізма перамаглі ў нашай краіне. Жывыя рысы камунізма ўжо выразна ўстаюць у нашым жыцці. Камунізм вырастае з творчай працы народа, гераічнай дзейнасці Кампартыі Савецкага Саюза. Камунізм — у яркіх агнях нашых будоўляў, у залацістых калгасных нівах, у новых школах, у палётах нашых касмічных караблёў з чалавекам на борце, ён — у фармаванні шматграннага, высокакультурнага, прыгожага чалавека, ва ўсіх вялікіх справах і смелых задумах савецкіх людзей.

Цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме — у гэтым урачыста запэўніла народ наша вялікая Камуністычная партыя.

НАСУСТРАЧ ТЫДНЮ РУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ У САЮЗЕ ПІСЬМЕННІКАЎ

У Савецкай Беларусі, якая за апошнія гады вітала на сваёй зямлі пісьменнікаў братніх рэспублік — Украіны, Літвы, Латвіі, Малдавіі, з 12 па 19 жніўня адбудзецца Тыдзень рускай літаратуры—яшчэ адно сведчанне непарушнай дружбы савецкіх народаў-братоў.

2 жніўня ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі адбылася прэс-канферэнцыя, прысвечаная Тыдню.

Старшыня праўлення СП Беларусі П. Броўка падкрэсліў, што, пачынаючы ад Максіма Горкага, які пераклаў купалаўскі верш «А хто там ідзе?», ніхто так многа не дапамагаў развіццю беларускага мастацкага слова, як пісьменнікі братняй Расіі. Дзякуючы дапамозе ў першую чаргу іменна рускіх пісьменнікаў, беларуская савецкая літаратура атрымала дарогу ў шырокі свет—да чытача братніх саюзных рэспублік і да замежнага.

Таму асаблівае хваляванне выклікае падрыхтоўка да Тыдня рускай літаратуры — гэтай урачыстай падзеі ў жыцці нашай рэспублікі.

Далей П. Броўка інфармаваў прысутных аб тым, як мяркуецца правесці Тыдзень.

Апроч вялікіх нізак твораў рускіх паэтаў, надрукаваных беларускімі часопісамі, да Тыдня выйдзе ў свет кніга «Вянок дружбы». Тут прадстаўлена ўсё напісанае рускімі паэтамі пра Беларусь і беларускімі—пра Расію. Творы друкуюцца на мове арыгінала. Будзе выдадзен шэраг кніг рускіх аўтараў у перакладах на беларускую мову (кнігі А. Пракоф'ева, М. Вірты, Л. Жарыкава і інш.).

Мяркуецца, што на Тыдзень прыедуць Даніл Гранін, Мікалай Грыбачоў, Юлія Друніна, Міхаіл Ісакоўскі, Марыя Камісарава, Аляксей Каплер, Уладзімір Кастроў, Ігар Кобзеў, Леанід Ленч, Яўгеній Мазалькоў, Яўгеній Папоўкін Аляксандр Пракоф'еў, Міхаіл Рыленкаў, Сяргей Сартакоў, Анатоль Сафронаў, Міхаіл Святлоў, Леанід Собалеў, Якаў Хялемскі.

Грамадскасць сталіцы будзе сустракаць дарагіх гасцей 12 жніўня. У гэты ж дзень у Палацы культуры прафсаюзаў адбудзецца ўрачысты вечар, прысвечаны адкрыццю Тыдня, на якім выступяць рускія і беларускія паэты.

Удзельнікі Тыдня пазнаёмяцца з Мінскам, наведаюць музеі сталіцы рэспублікі, пабываюць на Мінскім моры, сустрэнуцца з рабочымі камвольнага камбіната, аўтамабільнага і трактарнага заводаў. Яны наведаюць новабудоўлі і выдатныя мясціны рэспублікі. Для паездкі па рэспубліцы будуць створаны дзве брыгады.

Адна з брыгад паедзе па маршруту Мінск — Слуцк—Салігорск — Бярозаўская ДРЭС — Кобрын — Брэст—Белавежская пушча—Баранавічы — Навагрудак — Мінск. Удзельнікі гэтай брыгады выступяць перад рабочымі Салігорска, на гарадскім вечары ў Слуцку, перад рабочымі Бярозаўскай ДРЭС, на агульнагарадскім вечары ў Брэсце, сустрэнуцца з калгаснікамі Случчыны і г. д.

Удзельнікі другой групы, якія паедуць па маршруту Мінск—Лепель—Полацк—Браслаў—Нарач — Мінск, выступяць на агульнагарадскім вечары ў Лепелі, у зялёным тэатры на Нафтабудзе, на літаратурным вечары ў Браславе, перад калгаснікамі Браслаўшчыны і г. д.

Выступленні ўдзельнікаў Тыдня наладжваюць Беларускае радыё і тэлебачанне.

У заключэнне прэс-канферэнцыі П. Броўка падкрэсліў, што значэнне гэтай сустрэчы ўзрастае цяпер, калі ўся краіна рыхтуецца да з'езда слаўнай Камуністычнай партыі.

ГЕРОІ нашых дзён

ПА ЖЫЦЦІ КРОЧЫЦЬ ЧАЛАВЕК

Побач з табою па жыцці крочыць чалавек. Ты ведаеш яго даўно, прыгледзеўся, прывык да яго. Усё, што ён робіць, любіць, да чаго імкнецца, ты ўспрыймаеш як натуральнае, звычайнае і нічым асаблівым не прыкметнае. І табе няўцям, што ў гэтым чалавеку, як у фокусе лінзы, сабрана тое, чым вызначаецца наш сучаснік...

На Мінскім заводзе аўтаматычных ліній пра Аляксандра Філіча рабочыя гавораць:

— Хлопец, як хлопец, з галавою, працавіты.

Адны вымаўляюць гэтыя скупыя словы з цеплынёй, другія (праўда, такіх вельмі мала) — з лёгкай іроніяй, праз якую яскрава відаць зайздрасць.

...На стале канструктарскага бюро ляжыць выдатна выкананы чарцёж — «сінька». Недасведчаны ў тэхніцы, я раўнадушна гляджу на складаную і зусім незразумелую геаметрычную фігуру.

Мне тлумачаць:

— Гэта спецыяльны свердзел. Яго спраектаваў фрэзероўшчык інструментальнага цэха Аляксандр Філіч. Між іншым, у яго адукацыя — усяго толькі дзевяць класаў школы рабочай моладзі.

Цяпер я гляджу на чарцёж з павагай і нясмела пытаюся:

— Даруйце, а што дае гэты свердзел у параўнанні са звычайным?

Тлумачэнне літаральна здзіўляе мяне. Вось, коратка, сутнасць справы. У адной з дэталей неабходна было свідраваць фігурную адтуліну. Рабочаму даводзілася пры гэтым выконваць пяць аперацый, і ён мог за змену апрацоўваць 70 дэталей. Сканструяваны Філічам свердзел дазволіў яму ўсе аперацыі звесці ў адну і апрацоўваць за змену да 500 дэталей!..

І вось я ў цэху. Знаёмлюся з Філічам. Сапраўды, «хлопец як хлопец», вонкава нічым не прыкметны. Адно, што адразу запамінаецца, — добрая, адкрытая ўсмешка.

— Адну хвілінку,—просіць ён.

Хутка круціцца падобная на шасцярню фрэза, злізваючы нібы языком метал. Дужая рука спыняе станок.

Філіч здымае дэталь і адыходзіць з ёю ўбок, да стэлажу, на якім ляжыць разгорнуты чарцёж. Фрэзероўшчык схіляецца над ім, трошкі жмурыцца, потым лоб яго разгладжваецца. Ён узнімае галаву, глядзіць на мяне, усміхаючыся, і весела гаворыць:

— Парадачак. Цяпер можам і пагутарыць.

— Дзякую. Толькі ж я ў вас займу час...

— Не турбуйцеся. Учора гадзіны дзве засядалі і нічога, паспеў нагнаць, — перабівае мяне Філіч.

Потым я даведаўся, што напярэдадні заўком, членам якога з'яўляецца Філіч, размяркоўваў кватэры. Засядалі доўга. А калі з гэтай справай скончылі, Філіч за пяць гадзін апрацаваў столькі дэталей, колькі іншыя — за два рабочыя дні!..

Хлопец, безумоўна, здольны, майстар сваёй справы. Але сакрэт яго поспехаў не ў асаблівых прыродных дадзеных. Не! Для Філіча праца — творчасць, пастаянныя пошукі, імкненне ўносіць у вытворчасць новае, сваё...

Біяграфія Філіча — біяграфія многіх: у шаснаццаць год скончыў рамеснае вучылішча і з таго часу няспынна на вытворчасці. Цікаўнасць, пастаянае імкненне да ведаў памаглі яму даеканала авалодаць чатырма прафесіямі: стругальшчыка, электразваршчыка, слесара і фрэзероўшчыка. Быў час, вопытныя рабочыя перадавалі Філічу сваё майстэрства, а калі да яго прыйшла прафесіянальная стагласць, ён сам стаў вучыць іншых. Дзевяць кваліфікаваных фрэзероўшчыкаў з удзячнасцю ўспамінаюць свайго настаўніка з інструментальнага цэха. Свае адносіны да работы Філіч ніколі не абмяжоўвае элементарнымі патрабаваннямі: не дапускаць браку і выконваць заданне. Для яго на першым плане культура працы. Прыйдзіце ў цэх пад канец змены і вы ўбачыце, што Філіч ужо з вечара рыхтуе сваё рабочае месца да заўтрашняга дня, каб раніцаю не траціць лішняга часу на пошукі інструменту, агляд станка. Дарэчы, ён абавязаўся працаваць на сваім станку 15 год, не здаючы яго ў капітальны рамонт.

Чалавек, што прывык аналізаваць сваю дзейнасць і тыя з'явы, з якімі ён сутыкаецца ў жыцці, што пастаянна задае сабе пытанні: «Чаму так?», «А калі інакш?» — рана ці позна дасягне высокага рубяжа.

Іменна такі чалавек Аляксандр Філіч. Ён даўно ўжо стаў рацыяналізатарам і кожная яго прапанова заўсёды нараджалася як імкненне аблегчыць працу, узняць яе прадукцыйнасць. Дзесяткі прапаноў А. Філіча ўкаранёны ў вытворчасць і прынеслі вялікую карысць. Але рацыяналізатар усё ж адчуваў нейкую незадаволенасць, чагосьці яму не хапала... І вось год назад ён упершыню прыйшоў у створанае на заводзе грамадскае канструктарскае бюро. Тут ён стаў сапраўдным творцам.

Яму даручылі спраектаваць уласную вынаходку.

Філіч згадзіўся і пачаў працаваць у бюро пад кіраўніцтвам інжынера тав. Лаўрэнава. Не цяжка ўявіць сабе становішча чалавека зусім незнаёмага з асновамі чарчэння, які ўпершыню ўзяў у рукі лякала і рэйсшыну. Філіч успамінае:

— І смех і грэх быў. Тэарэтычна я не падрыхтаваны. Ішоў толькі ад практыкі. Намалюю, бывала, дэталь на паперы, замераю і перанясу на ватман. Цяпер не тое: чарцяжы чытаць навучыўся, як міліметры пераводзіць у градусы ведаю і, наогул, правілы чарчэння засвоіў. Але ніколі не забуду, як мне далі падпісаць чарцёж свайго першага праекта. Рукі дрыжалі... Выходзіць, і просты рабочы можа праектаваць. А колькі ў нас такіх, як я!

У гэтых словах — увесь Філіч. «Мне», «для сябе», — гэта не яго пазіцыі. Для справы, для калектыву, неадрыўнай часткай якога ён стаў, — вось пазіцыя Філіча, вось якія яго думкі і імкненні.

Ужо 12 розных праектаў распрацаваў Філіч — канструктар. І не толькі па сваіх рацыяналізатарскіх прапановах. Дапамога таварышу — для яго абавязковы закон. Так ён спраектаваў прыстасаванне для рэзьбашліфавальнага станка, прапанаванае рабочым Мешчараковым.

Камуніст Філіч карыстаецца на заводзе вялікім аўтарытэтам. Ён не толькі прымае ўдзел у рабоце прафсаюза, але і з'яўляецца членам заводскага навукова-тэхнічнага савета, і яго думку высока цэняць вопытныя інжынеры.

Заціх рабочы пасёлак. Але яшчэ доўга не спіць Філіч. Прымасціўшыся за сталом, ён чытае тэхнічную літаратуру, думае, вынаходзіць. Каб выконваць высокі абавязак камуніста, трэба быць узброеным ведамі. А. Філіч да адкрыцця XXII з'езда партыі абавязаўся выканаць сямігадовы план...

Вось такі Аляксандр Філіч, адзін са шматмільённай плеяды, народжанай нашым часам для вялікай творчасці...

А. БРАІЛОЎСКІ.

ПРЫСВОЕНА ВЫСОКАЕ ЗВАННЕ

Калегія Міністэрства культуры БССР пастанавіла прысвоіць званне Народнага тэатра тэатральнаму калектыву Браслаўскага раённага Дома культуры, улічваючы яго поспехі ў галіне развіцця тэатральнага мастацтва.

СУЧАСНАСЦЬ — ДУША НАРОДНАГА ТЭАТРА

У ПРАЕКЦЕ Праграмы КПСС дзейнасць народных тэатраў разглядаецца, як адметная з'ява камуністычнага грамадства і гаворка аб праблемах іх развіцця з'яўляецца надзвычай неабходнай. Шкада толькі, што цікавую размову, якую пачаў на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» А. Галёркін, вядуць пакуль адны кіраўнікі народных тэатраў. Ды і асноўную ўвагу яны аддаюць толькі арганізацыйным пытанням, якія іх больш за ўсё, відаць, хвалююць.

Народныя тэатры — з'ява новая, не да канца яшчэ асэнсаваная. Таму вельмі слушнай была б у гэтай размове думка нашых мастацтвазнаўцаў, крытыкаў, артыстаў, рэжысёраў прафесіянальных тэатраў, гледачоў. Трэба спадзявацца, што і яны выступяць.

УПАДТЭКСЦЕ некаторых артыкулаў кіраўнікоў народных тэатраў адчуваецца намаганне адмежаваць ад слова «самадзейнасць». Ствараецца ўражанне, што яно нават абражае іх. Яны не хочуць стаяць на адным узроўні са звычайнымі аматарамі, не хочуць пагаджацца з творчай бездапаможнасцю, выпадковым падборам людзей, неглыбокай працай, з усім тым, што яшчэ, на жаль, сустракаецца ў самадзейнасці.

Але пад словам «самадзейнасць» мы разумеем і такія выдатныя якасці, як самабытны талент, народнасць, свежасць выканання, шчырасць і г. д. Думаецца, што іменна гэта складае аснову сённяшніх народных тэатраў — самадзейных у самым лепшым значэнні гэтага слова. Іменна гэтым яны адрозніваюцца ад прафесіянальнага мастацтва. Людзі ствараюць матэрыяльныя багацці і ў той жа час адчуваюць у сабе вялікія духоўныя сілы для мастацтва. Артысты народных тэатраў — працаўнікі заводаў, калгасных палёў, разумовай працы і ў той жа час таленавітыя стваральнікі мастацкіх твораў і вобразаў. Гэта і ёсць галоўная рыса нашага новага жыцця перадкамуністычнай эпохі, аб'ектыўная прычына ўзнікнення народных тэатраў. Таму слова «тэатральная самадзейнасць» павінна гучаць сёння з гонарам, бо ў ім вельмі глыбокі сэнс.

Народныя тэатры сфарміраваны на аснове мацнейшых калектываў мастацкай самадзейнасці, з людзей, якія маюць значны вопыт сцэнічнай працы і моладзі, што ўпершыню выходзіць на падмосткі. Вядома, што ўсе яны не маюць ніякай школы сцэнічнага майстэрства, часта не ведаюць элементарных асноў мастацтва, не ведаюць, як працаваць над вобразам. Тэты прабел у некаторай ступені папаўняюць вопытныя рэжысёры на занятках і ў працэсе работы над спектаклем. Мы ведаем нямала поспехаў выканаўцаў народных тэатраў, калі талент падымаў іх на значную мастацкую вышыню. Але, калі гэты талент не будзе шліфавацца ў штодзённай рабоце і ўзбагачацца ведамі, то хопіць яго вельмі не надоўга. Потым пойдуць паўторы, штампы і страціцца свежасць.

Думаецца, кожнаму калектыву народнага тэатра, перш чым разгортваць шырокую дзейнасць і ствараць «мастацкую прадукцыю», абавязкова патрэбна прайсці свой студыйны перыяд, калі ў цэнтры ўвагі будзе настойлівая вучоба па авалоданню сцэнічным майстэрствам. Артысты на практычных занятках павінны прайсці ўвесь курс работы над вобразам, над спектаклем; даведацца, што такое прапанаваныя акалічнасці, сцэнічная праўда, ансамбль і мноства іншых «сакрэтаў» складанай тэатральнай навукі. Павінны яны ведаць, як працаваць над сабой, над голасам, грымам і г. д. Гэта ўсё тыя ступені, якія вядуць да прафесіянальнага ўзроўню.

Мы ведаем, што такі складаны курс навучання не здолеюць наладзіць самі мастацкія кіраўнікі тэатраў. Для гэтага патрэбны

Самадзейнасць? Так. Але НА ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫМ УЗРОЎНІ

спецыяльныя інструктары і педагогі, аб якіх павінна паклапаціцца Міністэрства культуры. Тут могуць значна дапамагчы шэфы—прафесіянальныя тэатры, Тэатральна-мастацкі інстытут, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР і іншыя.

Такія гурткі ўжо існуюць у некаторых народных тэатрах, але якасць навучання ў іх не ўсюды аднолькавая. Трэба, каб у рэспубліканскія тэатры часцей прыязджалі на семінары не толькі рэжысёры, але і артысты народных тэатраў, каб яны маглі паглядзець спектаклі, паназіраць за работай вопытных майстроў сцэны. Неўзабаве Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут пачне выпускаць рэжысёраў. Не дрэнна было б, каб некаторая частка іх была накіравана ў народныя тэатры, хаця б для двухгадовай творчай практыкі. Пры гэтым жа інстытуце існуюць курсы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. На іх трэба пасылаць найбольш здольных артыстаў народных тэатраў або арганізаваць для іх больш сціслы тэрмін вучобы.

Ёсць яшчэ дзесяткі шляхоў прафесіянальнага ўдасканалення, але ўсе яны ідуць праз вучобу. Без яе народны тэатр — не тэатр. Прыемна чытаць у артыкулах мастацкіх кіраўнікоў пра гісторыю зараджэння і творчы шлях таго ці іншага калектыву, але хацелася б таксама ведаць, як удзельнікі яго вучацца, як дабіваюцца таго, каб іх тэатр набыў прафесіяналізм.

І тут нельга абыйсціся без некаторых заўваг па рэпертуару.

ВЫНІКІ агляду лепшых спектакляў народных тэатраў і драматычных калектываў 1960 года паказалі, што найбольш удала народнымі ўмельцамі ўвасоблены на сцэне вобраз нашага сучасніка. Гэта — самаадданыя камсамольцы, легендарны Заслонаў, абаронцы Брэсцкай крэпасці, працаўнікі калгасных палёў і рабочыя прадпрыемстваў. Такая з'ява заканамерная, бо на сцэну сёння выйшлі таленавітыя прадстаўнікі таго пакалення, аб якім пішуць свае творы нашы пісьменнікі. Каму, як не ім, лепей ведаць свайго героя-таварыша і тыя ўмовы, у якіх ён дзейнічае і здзяйсняе свае велічныя справы. Думаецца, што ў гэтым зарука іх поспеху.

Аднак, знаёмячыся з рэпертуарнымі планамі народных тэатраў на будучае, усё больш і больш адчуваеш іх прыхільнасць да класікі, да складаных драматургічных твораў, якія не заўсёды пад сілу нават некаторым прафесіянальным тэатрам. Тут шырока прадстаўлена драматургія Горкага, Чэхава, Астроўскага і Шылера, лепшыя творы савецкай класікі. Ні ў якім разе мы не хочам сказаць, што народныя тэатры і мацнейшыя калектывы мастацкай самадзейнасці не маюць права на гэтыя п'есы. Але ўсяму свой час. Перш чым брацца за складаны класічны твор, выканаўцы народных тэатраў павінны валодаць хаця б элементарнымі ведамі акцёрскага майстэрства і мець некаторы сцэнічны вопыт.

Хочацца прыгадаць сёе-тое з практыкі старэйшага дзеяча беларускага мастацтва, выдатнага рэжысёра-педагога Е. Міровіча, які выхаваў таленавітае пакаленне артыстаў Тэатра імя Я. Купалы. У сваёй педагагічнай працы ён заклікаў маладога акцёра ніколі не брацца за ролю, якая яму яшчэ не па сілах. «Пачыналі мы ў яго спектаклях свой шлях з масавых сцэн, — успамінае народны артыст СССР Г. Глебаў, — з мастацкіх дэталей, затым з невялікіх роляў са словамі...» «Без школы масавых сцэн не можа быць сапраўднага акцёра», — настойліва з дня на дзень любіў паўтараць Е. Міровіч. Гэтыя словы як найлепш гавораць нам аб тым, што малады акцёр павінен ісці паступова ад простага да больш складанага, не надрываючы сваіх маладых акцёрскіх сіл. І ў першую ж чаргу гэтыя словы трэба аднесці да самадзейных артыстаў.

Класіка заўсёды патрабуе сталага майстэрства і жыццёвага вопыту не толькі ад галоўных выканаўцаў, але і ўсяго калектыву ў цэлым.

За 1960 год у рэпертуары народных тэатраў з'явілася больш дзесятка складанейшых твораў рускай і замежнай класікі. Уважлівы аналіз некаторых пастановак паказвае, што п'еса выбіралася часам толькі для аднаго-двух здольных выканаўцаў. Аб зладжаным акцёрскім ансамблі гаварыць тут ужо не прыходзіцца. У выніку — у гледача застаецца глыбокае пачуццё незадаволенасці паверхоўным паказам любімага твора.

Адзін з лепшых спектакляў народных тэатраў — «Ягор Булычоў» М. Горкага, паказаны мінскімі аўтазаводцамі на апошнім аглядзе народных тэатраў. У спектаклі былі адзначаны два найбольш удалыя вобразы — Ягора Булычова (Г. Яфімаў) і Аляксея (С. Дробыш). Аб іншых выканаўцах цяжка сказаць штонебудзь акрэсленае. Глыбокі сацыяльны змест горкаўскага твора застаўся нераскрытым, характары атрымаліся паверхоўнымі, адсутнічала адзінства акцёрскага ансамбля.

Гэта ў той ці іншай ступені датычыцца і астатніх спектакляў народных тэатраў па класічных п'есах.

Народныя тэатры выраслі на аднаактовай драматургіі і дайшлі да той ступені, калі ім пад сілу ўвасабляць значныя сучасныя творы. Народным аматарам больш блізкія і зразумелыя вобразы людзей сённяшняга дня. Думаецца, што і надалей народным тэатрам трэба замацоўваць свой поспех у гэтым напрамку, распрацоўваць вобраз нашага сучасніка. Бо на іх ляжыць пачэсная задача быць прапагандыстамі і выхавацелямі новага пакалення на вёсцы. Таму і рэпертуар іх павінен складацца ў асноўнай большасці з твораў сучаснай савецкай драматургіі ва ўсёй шырыні тых тэм, якія высоўвае жыццё.

Аднак, гэта не азначае, што народныя тэатры павінны зусім адмежавацца ад класічнай спадчыны. Класічны твор можа быць у рэпертуары народнага тэатра, але выбіраецца ён павінен глыбока прадумана, з улікам тых сіл і падрыхтаванасці, якія ёсць у калектыве. Рыхтаваце ён павінен не за месяц, не за два, як гэта звычайна бывае, а на працягу доўгага часу, каб удзельнікі спектакля маглі авалодаць сакрэтамі майстэрства, глыбока вывучыць унутраную сутнасць вобразаў і гістарычную эпоху п'есы. Няхай падобныя творы будуць удачамі не толькі аднаго-двух чалавек, а ўсяго калектыву. А калі клясіка будзе выбірацца толькі таму, што няма цікавай п'есы ці таму, што нехта з маладых акцёраў хоча сыграць тую ці іншую складаную ролю, хаця не мае належнай падрыхтоўкі і майстэрства, тады мала будзе карысці калектыву і гледачу.

З кожным днём разгараюцца творчыя апетыты энтузіястаў народнага драматычнага мастацтва. Часцей і часцей мы чуем абяцанне таго ці іншага народнага тэатра паставіць спектакль з вобразам дарагога ўсім Уладзіміра Ільіча. Баранавіцкі народны тэатр паказаў нядаўна прэм'еру п'есы М. Пагодзіна «Кветкі жывыя», дзе ролю Ул. І. Леніна выконвае артыст М. Аграновіч. Як абавязацельства да XXII з'езда КПСС бярэ на сябе пастаноўку спектакля з вобразам вялікага правадыра Народны тэатр Палаца культуры Аршанскага ільнокамбіната. Такія ж планы ёсць і ў іншых калектывах.

Вобраз Леніна на сцэне — вынік шматгадовай творчай працы нешматлікіх прафесіянальных артыстаў, якія ўсё жыццё працуюць над тым, каб спасцігнуць веліч і прастату генія чалавецтва. І нават не ўсім ім гэта ўдаецца. А тут за некалькі месяцаў, самадзейнымі сіламі... Па меншай меры несур'ёзна, хоць і можна зразумець творчы энтузіязм артыстаў. Аднак непаўнацэннасць увасаблення класікі глядач яшчэ можа дараваць, але недасканалы вобраз Ільіча — ніколі. Вядома, імкнуцца паказаць вобраз Ул. І. Леніна на самадзейнай сцэне — мэта народных тэатраў, але мэта будучага.

ДЗЕЙНАСЦЬ народных тэатраў Беларусі яшчэ не стала ў цэнтры ўвагі нашай тэатральнай крытыкі. Перыядычны друк больш абмяжоўваецца кароткімі інфармацыямі аб новых спектаклях, чым дае разгорнутыя рэцэнзіі. Гэта тлумачыцца тым, што нашы тэатразнаўцы рэдка бываюць у тэатральнай самадзейнасці. Звычайныя працоўныя будні калектываў рэдка трапляюць на старонкі друку. А пара ўжо гаварыць аб рабоце народных тэатраў поўным голасам, глыбока аналізуючы іх дасягненні і недахопы.

Сталічны глядач да гэтага часу амаль зусім не знаёмы з работай народных тэатраў рэспублікі, калі не лічыць аглядаў, якія бываюць не так ужо і часта. Хацелася б паставіць на абмеркаванне такое пытанне, як прыезд на суботу і нядзелю кожнага народнага тэатра ў Мінск для паказу свайго лепшага спектакля сезона. У нас ужо столькі калектываў, што іх цяжка паказаць па разу на год. Гэта можна арганізаваць у Палацы прафсаюзаў, клубе імя Ф. Дзяржынскага або на якой-небудзь іншай плацоўцы звычайнага клуба. Пара вярнуцца да работы «Тэатра народнай творчасці», які калісьці быў арганізаваны ў Мінску. Няма патрэбы даказваць карысць гэтага мерапрыемства, якое вырашыць многія сёння ўзнятыя пытанні.

С. ПЯТРОВІЧ,
аспірант Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР.

Наступным у абмеркаванні праблем развіцця народных тэатраў рэспублікі выступіць у газеце дырэктар Барысаўскага Дома культуры М. Малчанскі.

Сярод кніг

КУЛЬТУРА—ЗДАБЫТАК НАРОДА

Кожная новая кніга аб дзейнасці Камуністычнай партыі сустракаецца грамадскасцю з вялікай цікавасцю. У гэтым—прызнанне вялікага аўтарытэту КПСС у народных масах. І вельмі радасна, што за апошні час ажывілася творчая актыўнасць гісторыкаў і з'яўляюцца усё новыя і новыя працы, прысвечаныя пытанням гісторыі партыйных арганізацый саюзных рэспублік, у тым ліку і Камуністычнай партыі Беларусі.

Адна з такіх кніг — манаграфія П. Сіліванчыка «Дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі па ажыццяўленню культурнай рэвалюцыі ў рэспубліцы», выйшла нядаўна ў свет.

Сваё даследаванне аўтар пачынае з кароткага пераказу ленінскага плана культурнай рэвалюцыі ў краіне, пераканальна раскрывае яе заканамернасць і гістарычную непазбежнасць. Сацыялістычная перабудова грамадства немагчыма без глыбокіх пераўтварэнняў у галіне культуры. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, ствараючы новыя грамадска-эканамічныя адносіны, зрабіла карэнны пералом у поглядах, ідэях і, значыць, у свядомасці, быце, культуры людзей. Гэты матэрыял у кнізе асвятляецца падрабязна і пераканальна.

У рэвалюцыйным пераўтварэнні краіны, у ліквідацыі культурнай адсталасці працоўных выключна важнае значэнне мела дзейнасць партыі ў галіне народнай асветы. Зразумела, што вырашэнне грандыёзных задач культурнага будаўніцтва патрабавала, у першую чаргу, ліквідацыі непісьменнасці. Гэтая задача вырашалася з сапраўды рэвалюцыйным размахам. Трэба сказаць, што даследчык, выкарыстоўваючы багаты фактычны матэрыял, добра паказаў працэс ліквідацыі непісьменнасці ў рэспубліцы, формы і метады, якія распрацавала і прымяняла Кампартыя Беларусі, выконваючы гэтую задачу.

Цікавы таксама матэрыял па гісторыі стварэння ў Беларусі шырокай сеткі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, што мела рашаючае значэнне ў справе падрыхтоўкі нацыянальных кадраў інтэлігенцыі. Аўтара цікавяць не толькі мерапрыемствы партыі па забеспячэнню росту сеткі ВНУ. Ён аналізуе і тыя глыбокія змены, што адбыліся ў арганізацыйнай структуры вышэйшай школы, у сістэме і метадах яе дзейнасці.

Раздзел кнігі, прысвечаны даследаванню мерапрыемстваў Кампартыі Беларусі па развіццю народнай асветы і росту масавых кадраў інтэлігенцыі, з'яўляецца самым буйным па аб'ёму і найбольш грунтоўным па зместу і характару выкарыстання крыніц. Тут шырока прадстаўлены артыкулы параўнальна мала вядомых выданняў, а таксама архіўныя матэрыялы, пра многія з якіх упершыню ідзе гутарка.

Як вядома, ленінскі план камуністычнага будаўніцтва ў СССР прадугледжваў стварэнне сацыялістычнай культуры на базе эканамічнай перамогі над буржуазіяй. Ул. І. Ленін неаднаразова падкрэсліваў сувязь эканамічнага і культурнага будаўніцтва, указваў, што культурная рэвалюцыя ў нашай краіне павінна развіцца ў простай і непарыўнай сувязі з развіццём і ўмацаваннем сацыялістычнага спосабу вытворчасці, сацыялістычных вытворчых адносін, што «... патрэбна пэўнае развіццё матэрыяльных сродкаў вытворчасці, патрэбна пэўная матэрыяльная база». Значыць, ліквідацыя непісьменнасці, знішчэнне бескультурнасці патрабавалі стварэння матэрыяльных прадпасылак. Аднак П. Сіліванчык, даследуючы працэсы развіцця культурнай рэвалюцыі, не дае характарыстыкі поспехаў рэспублікі ва ўздыме эканомікі, у павышэнні матэрыяльнага дабрабыту працоўных.

Галоўны змест усёй культурна-выхаваўчай работы праяўляецца ў першую чаргу ў вырашэнні ідэалагічных праблем. Таму аўтар і пачынае даследаванне барацьбы КП(б)Б за развіццё культурна-асветнай работы з растлумачэння выхаваўчых задач партыі, якія вынікаюць непасрэдна з сутнасці дыктатуры пралетарыята.

Гаворачы аб тым, што ва ўсёй ідэалагічнай рабоце выключна важнае месца належыць друку—магутнаму сродку фармавання свядомасці працоўных, арганізатару мас,—П. Сіліванчык паказвае развіццё сеткі газет і часопісаў у рэспубліцы. У 1926 годзе ў Беларусі выходзіла толькі 17 газет тыражом 90,6 тысяч экземпляраў. У 1938 годзе ужо выдавалася паўмільённым тыражом 199 газет, з якіх 149—на беларускай мове. У кнізе прыводзяцца цікавыя дадзеныя аб арганізацыі выдавецкай справы ў рэспубліцы.

Аўтар падкрэслівае, што культурна-асветныя ўстановы прымалі актыўны ўдзел у ідэалагічнай рабоце партыі і за кароткі тэрмін сталі неад'емнай часткай грамадскага жыцця.

Аўтар правільна робіць, што не абмяжоўваецца апісаннем работы клубаў і бібліятэк, а спыняецца на той ролі, якую адыгралі ў палітычным і культурным жыцці беларускага народа радыё і кіно. На жаль, ён піша аб гэтым бегла і павярхоўна.

Культурная рэвалюцыя ў СССР забяспечыла буйныя поспехі ў галіне літаратуры, тэатра, музыкі. Развіццё літаратуры і мастацтва з'яўляецца прадметам пастаяннай увагі Камуністычнай партыі, вынікам правільнай нацыянальнай палітыкі. Вельмі цікавы раздзел кнігі, дзе аўтар даследуе працэс станаўлення беларускай літаратуры і мастацтва.

Беларуская літаратура 20-х — 30-х гадоў—разнастайная па жанрах і прыёмах майстэрства. Трэба сказаць, што аўтар зрабіў рад цікавых назіранняў пры даследаванні гісторыка-літаратурнага працэсу 20-х гадоў. Асабліва гэта датычыць характарыстыкі літаратурных арганізацый («Маладняк», «Узвышша», «Полымя» і інш.), барацьбы перадавых дзеячоў мастацтва з праявамі фармалізму і натуралізму. Вельмі важна, што пры гэтым аўтар шырока выкарыстоўвае адпаведныя матэрыялы партыйных з'ездаў, пленумаў, пастановы ЦК КП(б)Б, раскрывае сутнасць перагрупіровак творчых сіл.

Але варта адзначыць, што раздзел аб літаратуры і мастацтве перагружаны другараднымі фактамі. Якую цікавасць, напрыклад, можа ўяўляць простае пералічэнне імён аўтараў, выканаўцаў, назвы твораў, што займае некалькі старонак? У гэты ж час некаторыя гістарычна важныя пытанні не атрымалі належнага асвятлення (Першы з'езд пісьменнікаў БССР, тэатральная дыскусія і г. д.).

У кнізе ёсць асобныя фактычныя недакладнасці. На старонцы 158-ай аўтар цвярджае, што меры па далейшаму развіццю Інбелкульта прыняты трэцяй сесіяй ЦВК БССР 6-га склікання. У сапраўднасці новы статут Інбелкульта зацверджан ЦВК і СНК БССР крыху раней (25 чэрвеня 1924 г.). У новым статуце былі вызначаны перспектывы ператварэння Інбелкульта ў Акадэмію навук.

Нягледзячы на некаторыя недахопы, кніга П. Сіліванчыка з'яўляецца сур'ёзным укладам у справу вывучэння культурнага будаўніцтва ў БССР. Яна, бясспрэчна, будзе цікавай не толькі для гісторыкаў, але і для шырокага кола чытачоў.

У заключэнне нельга абыйсці маўчаннем даволі дзіўную акалічнасць: кніга аб культурнай рэвалюцыі ў БССР выдадзена тыражом ўсяго у 600 экземпляраў.

К. ЦЭЛІКАВА.

П. П. Сіліванчык. Дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі па ажыццяўленню культурнай рэвалюцыі ў рэспубліцы. Выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Мінск, 1961.

ПАКАЗ І ПЕРАКАЗ

Падзеі аповесці Леаніда Гаўрылкіна «Каця», надрукаванай у «Маладосці», адбываюцца ў беларускай вёсцы Зарадзвінне. У творы паказана, як калечыць свядомасць людзей рэлігійны дурман, як сектанты-штундысты заманьваюць у сваё кодла даверлівых людзей, як наша грамадскасць вядзе барацьбу з рознымі праявамі баптызму.

Усе асноўныя падзеі аповесці звязаны з «барацьбой за душу» галоўнай гераіні твора Каці.

Пра яе мінулае аўтар гаворыць даволі скупа. Скончыўшы дзесяцігодку, Каця збіралася пайсці працаваць у калгас на жывёлагадоўчую ферму. Але ёй перашкодзіла мачыха. Дзяўчына ўладкавалася на чыгунку пуцявой вартаўніцай. Там, як мімаходзь паведамляе аўтар, сустрэў Кацю нейкі студэнт-практыкант, ашукаў дзяўчыну. «Каця не стала яго шукаць — сілаю міл не будзеш».

Калі нарадзілася ў Каці дзіця, з мачыхай жыць стала немагчыма. За кожную капейку ўспыхвалі сваркі. Урэшце мачыха выгнала Кацю з малым дзіцем з хаты. У гэты момант (адсюль і пачынаецца ўласна апавяданне) і завітала да дзяўчыны на работу баптыстка Аўдоцця Лямех, запрасіла яе да сябе на кватэру. Пад уплывам Аўдоцці Каця пачынае наведваць малітоўны дом, куды спачатку зайшла проста дзеля цікавасці. Хлапец Андрэй, які таксама наведваў секту, звярнуў на Кацю ўвагу. Каця адчувае сімпатыю да хлопца.

Спачатку яна не бачыць нічога благога ў штундысцкіх сходах, але пасля паступова пераконваецца, што кіраўнікі секты выкарыстоўваюць рэлігійнасць людзей у сваіх мэтах. Жыццёвыя сутыкненні ў розных абставінах з кіраўніком секты Фёдарам Чубком, Аўдоцяй Лямех, Андрэем адкрываюць ёй вочы на многае.

Дапамагаюць Каці вырвацца са штундысцкіх путаў прадстаўнікі вясковай інтэлігенцыі і партыйныя работнікі — старшыня сельсавета Міхаіл Карэба, сакратар райкома партыі Мікалай Ляшчук, прапагандыст Аляксей Пархоменка.

Каця паступова выпростваецца, сэрца яе зноў адкрыта людзям.

На такім матэрыяле, безумоўна, можна пабудаваць цікавы твор. Леаніду ж Гаўрылкіну гэта, на мой погляд, не зусім удалося.

Дастаткова пераканальна выпісаны аўтарам вобразы Чубка і Аўдоці Лямех. У іх лёсе шмат агульнага. Абое раслі ў аднолькавым асяроддзі, дзе панаваў дамастрой, дзе магутны дыктаваў волю слабому, дзе прывыклі жыць не сённяшнім, а ўчарашнім.

Перад смерцю бацька наказвае Аўдоці маліцца, і яна слепа выконвае нікчэмную запаведзь, ходзіць у малітоўны дом. Калі ж муж Іван паўстае супраць гэтага, верхаводы баптыстцкай шайкі штурхаюць Аўдоцю на разрыў з мужам. Сыйшоўшы з правільнай дарогі ў жыцці, Аўдоцця паступова становіцца на шлях злачынства — спекулюе, вядзе разбэшчанае жыццё.

Андрэй, атручаны воўчай філасофіяй бацькі, вырас баязліўцам. Ён не здольны пастаяць за сябе, за сваё шчасце. Была ў хлопца, скажам, схільнасць стаць музыкам, але бацька пашкадаваў грошай на баян. Андрэй пакінуў школу, не атрымаўшы сярэдняй адукацыі. Бацька прывучае яго да чарачкі, прыстасоўвае да мяшчанскага спосабу жыцця, да хлусні. І ў выніку, пакахаўшы Кацю, захацеўшы з ёю жаніцца, Андрэй не можа рашуча выступіць супраць бацькавай забароны.

— Гэтаму не быць! — стукнуў па стале Чубок... — ... Я табе забараняю з ёй бадзяцца. Чуеш?

— Яна ж сястра наша, — прашаптаў Андрэй.

— Сястра! Сястра!

А пасля, выйшаўшы з сынам з хаты, Чубок дадаў: «Навошта табе чужых карміць, зарабі хлеба хаця сваім дзецям».

Вось ён, фальшывы гуманізм, пра які так гучна распінаюцца баптысцкія прапаведнікі!..

Чытачу ясна, што такія двурушнікі, як Чубок і да яго падобныя, прыкрываючыся верай у бога, ніколі не кінуцца ў ваду ратаваць таго, хто тоне. Нажыва — вось іх бог і іх мэта. Чубок, напрыклад, займаецца самагонакурэннем. За грошы і за кавалак анучы такія людзі гатовы затаптаць у гразь і роднае дзіця.

Менш пераканаўча намаляваны празаікам іншыя героі. Аўтар цалкам не выкарыстоўвае тых магчымасцей, якія даюць знойдзеныя ім сюжэтныя сітуацыі для раскрыцця псіхалогіі герояў.

Возьмем хоць бы галоўную гераіню. Аўтар нібы скоўвае яе ўчынкі, паказвае Кацю такой, што яна ні на што не здольна сама, мачыха выправіла яе на чыгунку працаваць, потым — выгнала з хаты, практыкант — падмануў, Аўдоцця — аблытала.

Там, дзе наспявае канфлікт, дзе гераіня павінна дзейнічаць сама, дзе яна павінна прыняць рашэнне, аўтар абрывае сюжэтную нітку. «Начальства» пераводзіць яе на іншую кватэру, на іншую працу. Замест паказу герояў, якія дапамагаюць Каці, аўтар укладвае ў іх вусны напышлівыя дэкларацыі. Урэшце, Каця магла б перайсці на іншую кватэру і без дапамогі Аляксея і Веры, бо яна ў той вечар, калі апошні раз зайшла ў малітоўны дом, зразумела, што Андрэй, атручаны «філасофіяй» бацькі, — чужы ёй чалавек, бо пайшоў на падман. Дык ці варта было так моцна акцэнтаваць у аповесці «кватэрнае пытанне»?..

Бледнымі фарбамі напісаны эпізод прыходу Аляксея ў малітоўны дом, калі ён выкрывае Чубка як жуліка. Апроч таго, што тут не знойдзены адпаведныя сродкі для перадачы ўнутраных зрухаў у душы Каці, якія канчаткова штурхнулі яе ўстаць і выйсці з малітоўнага дома, дык аўтар яшчэ паўтарае і блытае тое, аб чым гаварылася ў творы раней.

Так, напрыклад, пра Чубка на стар. 40 ён піша: «Чубок здабыў сабе фіктыўныя дакументы (стаў старэй на дзесяць год) і ўхіліўся ад прызыву ў армію». А ў гэтай сцэне Аляксей так звяртаецца да Чубка: «Вы заклікаеце ўсіх быць сумленнымі... а самі падрабляеце дакументы, змяншаеце сабе дзесяць год, ашукваеце дзяржаву». Так чытач і не ведае: Чубок падмаладзіў сабе гады ці наадварот. А ўзрост персанажа твора — рэч не другарадная.

Спрошчаны ў творы вобраз Івана — мужа Аўдоці. У пачатку аповесці ён чалавек высокай свядомасці, які ўмее шанаваць свой гонар, не паддаецца капрызам жонкі, якая штурхала яго да нажывы. А пасля разрыву з жонкай стаў заўзятым шабашнікам, які ганяецца за доўгім рублём. Гэтаму павароту ў яго характары абгрунтавання ў творы няма.

Атрымліваецца такое ўражанне, што аўтар, які зрабіў заяўку на цікавы твор, пакуль што спыніўся на паўдарозе. Мастацкі паказ падзей і душы персанажаў ён часам падмяняе пераказам.

Алесь КУЗНЯЦОЎ,
рабочы будаўнічага ўпраўлення № 19.

Мінск.

РАДАСЦЬ ТВОРЧАСЦІ У ПОШУКАХ НОВАГА

Патанцавала мінчанам гэтым летам. Яны ўбачылі на сталічнай сцэне спектаклі амаль усіх абласных тэатраў рэспублікі.

З поспехам выступіў Магілёўскі тэатр, спадабаліся шматлікім аматарам сцэнічнага мастацтва спектаклі Гродзенскага тэатра, які днямі заканчвае ў Мінску свае гастролі.

2 жніўня прыехаў у нашу сталіцу са сваімі спектаклямі Гомельскі тэатр.

Нельга было чакаць, што ўсе тэатры прывязуць на гастролі абсалютна бездакорныя спектаклі. Тым не менш многія іх пастаноўкі парадавалі гледачоў. Сярод іх можна назваць «Усё застаецца людзям» (Магілёўскі тэатр), «Салдаты», «У сябе ў палоне», «Дзеля сваіх блізкіх», «Тры таварышы» (Гродзенскі).

На жаль, існуюць яшчэ ў тэатрах спектаклі, якія проста адштурхоўваюць гледача сваёй мастацкай недасканаласцю, сцэнічным прымітывам. Часам гэта звязана з тым, што ў іх заняты акцёры, пазбаўленыя таленту, натхнёных адносін да сваёй творчай працы, а то проста непрыдатныя да той ці іншай ролі. Гледзячы такія спектаклі, часта думаеш, чаму, напрыклад, дазваляюць пажылым актрысам іграць ролі маладых жанчын, якія не стасуюцца да іх творчых індывідуальнасцей, а даручаны ім толькі таму, што яны з'яўляюцца жонкамі дырэктараў ці галоўных рэжысёраў. Навошта ў рэпертуар уключаюцца часам п'есы са спевамі, і безгалосыя акцёры псуюць усё ўражанне, бездапаможна намагаючыся спяваць.

Калі мы гаворым аб развіцці тэатральнай культуры, мы павінны мець на ўвазе яе новы, больш высокі этап. Дбаючы аб гэтым, трэба паставіць да дзейнасці прафесіянальных тэатраў з большай патрабавальнасцю, намагаючыся знішчыць у іх коснасць і руціну. Я маю на ўвазе павярхоўнасць і застой рэжысёрскай думкі ў некаторых пастаноўках. Возьмем, напрыклад, спектакль Магілёўскага тэатра «Драпежніца» па п'есе Э. Фабра. Якую ідэю і творчую задачу вырашае рэжысёр М. Харошка ў гэтай пастаноўцы? Паказаць, што культ Напалеона вельмі моцна жыве ў Францыі і да сённяшняга дня? Што зацікавіла рэжысёра ў выбары гэтай п'есы? Хітрая інтрыга і пікантнасць сюжэта? Як можна ў наш час ставіць такія безідэйныя спектаклі?

Сучаснасць гэта—не толькі тэма, а ў першую чаргу светапогляд. І сучасная па матэрыялу п'еса можа не адпавядаць сённяшняму светапогляду, а класічны твор з жыцця мінулага можа прагучаць са сцэны вельмі сучасна. У залежнасці ад таго, што гэта за твор і як прачытаў яго рэжысёр. Мінчане бачылі пастаноўку І. Папова «Без віны вінаватыя» па п'есе А. Астроўскага ў Гродзенскім драматычным тэатры. Калі глядзіш гэты спектакль, думаеш, чым жа ён адрозніваецца ад пастаноўкі, зробленай трупай антрэпрэнёра Бяляева ў Мінску ў дарэвалюцыйныя гады, якую мне яшчэ давялося бачыць? Хіба толькі тым, што там іграл лепш. У спектаклі Гродзенскага тэатра ролю Кручыніной выконвае актрыса М. Папова, а між тым, у яе няма для гэтага дадзеных.

Сучаснае савецкае мастацтва—мужнае у сваёй аснове, яму не ўласцівы сентыментальнасць, хрысціянская жаласлівасць, песімізм і кволасць пачуццяў. Артыст савецкага тэатра абавязаны глыбока мысліць, разумець сацыяльную аснову сюжэтаў Астроўскага, умовы тых часоў, якія на кожным кроку спараджалі трагедыі Кручыніных. А хіба гэта ёсць у спектаклі гродзенцаў? Рэжысёр падыйшоў да п'есы непрынцыпова.

Мы не маем падставы сказаць, што цалкам збяднела сучасная рэжысёрская думка ў нашых тэатрах. Яна адчуваецца ў некаторых спектаклях таго ж І. Папова, Ю. Шчарбакова, Б. Эрына, Б. Арынянскага, М. Співака, В. Броўкіна і іншых спрактыкаваных і больш маладых рэжысёраў. Але ж на сцэне яшчэ з'яўляюцца спектаклі, пазбаўленыя свежай думкі, рэжысёрскага майстэрства.

Калі мы гаворым аб уздыме культуры тэатра, то яе перш за ўсё трэба пачынаць з работы рэжысёра як галоўнага арганізатара і натхняльніка спектакля.

Трэба адзначыць, што гастролі абласных тэатраў у Мінску парадавалі акцёрскімі знаходкамі, адкрылі многа новых цікавых імён. Перш за ўсё хочацца назваць артыста Магілёўскага тэатра М. Радзіёнава. Створаны ім вобраз Дронава ў спектаклі «Усё застаецца людзям» поўны выключнай глыбіні і жыццёвай дакладнасці. З высокім майстэрствам выступаў акцёр у камедыі Шэкспіра «Утаймаванне свавольніцы». Дакладная акцёрская тэхніка і глыбокае разуменне вобраза праяўлены М. Радзіёнавым у выкананні ролі Броўдзі ў драме «Замак Броўдзі».

Гледачоў захапіла яркая індывідуальнасць выпускніцы Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, артысткі Гродзенскага тэатра Т. Шашкінай, якая бліскуча выканала ролі Любы («Салдаты»), Патрыцыі Хольман («Тры таварышы»), вясёлай і жыццярадаснай студэнткі Машы Клімавай («У сябе ў палоне»). Што захапляе ў выкананні Т. Шашкінай? Не толькі глыбокае разуменне сутнасці вобраза, адчуванне жанра, але і тонкае майстэрства ў раскрыцці пачуццяў герояў, праўдзівыя, жыццёва дакладныя паводзіны на сцэне.

Прыемна было бліжэй пазнаёміцца з артыстам Магілёўскага драматычнага тэатра А. Радаковым. Выконваючы ролю Петручио («Утаймаванне свавольніцы»), ён стварыў вобраз моцнага, валявога чалавека, вельмі характэрнага для шэкспіраўскіх спектакляў. Вельмі цікава і тэмпераментна іграе артыстка Н. Фаворская Катарыну.

Прыемнае знаёмства мелі нашы гледачы і з артыстамі Гродзенскага тэатра Г. Корнам і В. Касценкам.

Прывабная і своеасаблівая камедыйная манера ў акцёра Гродзенскага тэатра Г. Дубава. Яго Гога («Салдаты») і Віця Белкін («У сябе ў палоне») незабыўныя. Яркія сцэнічныя дадзеныя і акцёрская прывабнасць вылучаюць маладую актрысу Магілёўскага тэатра І. Дашкоўскую. Выканаўшы ёю ролі Машы («Час кахаць») і Біянкі («Утаймаванне свавольніцы») сведчаць аб яе цікавых сцэнічных магчымасцях. Здольным майстрам паказаў сябе і малады артыст Б. Дружной.

Цяжка пералічыць усіх здольных, спрактыкаваных майстроў сцэны і прадстаўнікоў маладога пакалення ў абласных тэатрах. Іх многа.

Але іх было б яшчэ больш, калі б у тэатрах правільна вырашалася справа камплектавання калектываў.

Савецкі тэатр, як правіла, імкнецца да стабілізацыі. Мінуў той час, калі пасля кожнага сезона акцёр вандраваў з Керчы у Волагду, з Хабараўска ў Гродна. Аднак пры стабільнасці трупы абмяжоўваецца творчае спаборніцтва. Актрыса, якая выконвала ролі хлопчыкаў і дзяўчынак, з цягам часу старэе і вымушана пераходзіць на ролі характарных персанажаў. Тое самае адбываецца з выканаўцамі роляў маладых герояў і гераінь. Такім чынам у стабільнай трупе праз некалькі год становіцца залішне многа акцёраў на адны ролі і мала на другія. У такім выпадку рэжысура не можа правільна размеркаваць акцёраў у спектаклі.

З мэтай далейшага развіцця тэатральнай справы ў мінулым годзе быў прыняты конкурсны парадак замяшчэння творчых работнікаў у тэатрах. Наколькі гэта неабходна і мэтазгодна, можна меркаваць па многіх прыкладах. Артыстка Магілёўскага тэатра Л. Гамуліна не мела ў гэтым тэатры творчага разгарнення, бо актрыс яе плана там было многа. Калі ж яна перайшла ў Гомельскі тэатр, дык хутка заняла там вядучае становішча і атрымала званне заслужанай артысткі рэспублікі.

Вельмі слаба абнаўляецца трупа ў Акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. У выніку — больш чым трэцяя частка акцёраў пенсіённага ўзросту не выконвае нават паловы сваіх норм выступленняў. У тэатры ёсць даволі значная група акцёраў, якія ў пасляваенныя гады выпадкова трапілі сюды. Яны не маюць перспектывы росту, не могуць замяніць асноўныя акцёрскія сілы і ў той жа час займаюць месцы, якія з поспехам маглі быць заняты выпускнікамі Тэатральна-мастацкага інстытута па конкурсу.

Шкодзяць справе розныя групавыя і сямейныя ўзаемаадносіны, якія склаліся не толькі ў Тэатры імя Янкі Купалы, але і ў іншых тэатральных калектывах з прычыны не прынцыповага, не дзяржаўнага падыходу да справы з боку тэатральных кіраўнікоў. Скажам, жонка дырэктара Магілёўскага тэатра актрыса Н. Акульшына выступае ў вядучых ролях у спектаклях «Час кахаць» (Клаўдзія Герасімаўна) і «Усё застаецца людзям» (Наталля Дзмітрыеўна). Яна зніжае якасць добрых спектакляў сваім слабым выкананнем.

Мы не супраць таго, каб жонкі рэжысёраў і дырэктараў выступалі ў спектаклях, вядома, калі яны актрысы. Але трэба, каб яны іграл тыя ролі, што ў іх творчых магчымасцях, а не ўсё, што яны пажадаюць.

Ненармальнае становішча, якое склалася ў тэатрах з камплектаваннем труп, адмоўна адбіваецца на якасці спектакляў нават у Акадэмічным тэатры. Калі яго кіраўніцтва не прыме рашучых мер, не арганізуе конкурснага замяшчэння акцёрскіх пасад, справа не зрушыцца з месца.

Час рашуча патрабуе ад працаўнікоў прафесіянальных і народных тэатраў росту майстэрства. Тэатральнае мастацтва павінна быць узнята да ўзроўню духоўнага жыцця народа. А гэта магчыма зрабіць толькі тады, калі ўсе элементы тэатра, пачынаючы ад яго афішы і заканчваючы культурай спектакляў, будуць на належнай вышыні. Прафесіянальныя тэатры толькі тады апраўдаюць сваё прызначэнне, калі яны будуць узорамі высокай ідэйнасці і мастацкага характэра, не толькі прадаўжальнікамі лепшых традыцый мастацтва мінулага, але калі яны, развіваючы і паляпшаючы гэтыя традыцыі і тэатральныя сістэмы, будуць у той жа час смелымі наватарамі, разведчыкамі будучыні, калі яны будуць разглядаць сваё мастацтва як натхнёную песню душы, а не прафесіянальную звычку.

«У мастацтве сацыялістычнага рэалізму, заснаваным на прынцыпах народнасці і партыйнасці, смелае наватарства ў мастацкім паказе жыцця спалучаецца з выкарыстаннем і развіццём усіх прагрэсіўных традыцый сусветнай культуры. Перад пісьменнікамі, мастакамі, музыкантамі, дзеячамі тэатра і кіно адкрываецца шырокая прастора для праяўлення асабістай творчай ініцыятывы, высокага майстэрства, для разнастайнасці творчых форм, стыляў і жанраў»,—гаворыцца ў праекце Праграмы Камуністычнай партыі. Гэтыя словы клічуць усіх дзеячоў мастацтва да новых творчых пошукаў, да новых вышынь.

Яўген РАМАНОВІЧ.

Артысты прыехалі! Гэтая вестка, як маланка, абляцела калгас.

ЦЫМБАЛЫ ГУЧАЦЬ НАД ПАЛЯМІ

Яшчэ зусім нядаўна закончыліся канцэрты Беларускага народнага аркестра на зялёных эстрадах абласных гарадоў нашай рэспублікі, а музыканты зноў у дарозе. Беларускую музыку і песню ў іх выкананні цяпер пачуюць і калгаснікі.

Артысты прыехалі... Гэтая вестка, як маланка, абляцела калгас «Прамень камуны» Слуцкага раёна. Прыезд прафесіянальнага музычнага калектыву — вялікая радасць для калгаснікаў. Пакуль настройвалі цымбалы на імправізаванай эстрадзе, з'явіліся першыя слухачы — вясковыя хлопчыкі і дзяўчынкі. З іншых брыгад на аўтамашынах, веласіпедах пачалі з'язджацца даяркі, свінаркі, паляводы, садаводы. Ужо не было свабодных месц, а гледачы ўсё прыбывалі.

Гарачае прывітанне калгаснікам перадаў народны артыст БССР І. Жыновіч. Ён расказаў пра творчы шлях аркестра, пра яго інструменты, падзяліўся творчымі планамі.

Канцэрт закончаны, але доўга яшчэ не разыходзіцца публіка, узнікаюць ажыўленыя размовы, гутаркі.

— Прыязджайце да нас часцей, — гаворыць калгасны садоўнік Г. Пратасеня.

— Добрыя справы ў нас у калгасе, нашы людзі цягнуцца да культуры, і вы ў нас жаданыя госці,—гаворыць агранам В. Лімчык.

— Вялікае дзякуй, — ад імя ўсіх гаворыць старшыня Серадніковскага сельсавета А. Блышынская.

Нашы выступленні адбываліся ўдзень, увечары і нават уначы. Даводзілася чакаць, пакуль управяцца даяркі на фермах і з іншых брыгад збяруцца людзі.

Канцэрт у калгасе імя Сталіна Капыльскага раёна пачаўся позна ўвечары на двары праўлення, і калгасныя электрыкі паклапаціліся, каб музыкантам было светла, павесілі гірлянды лямпачак.

У нядзелю надвор'е было дрэннае. У гэты дзень мы прыехалі ў калгас імя Калініна Слуцкага раёна. Тройчы спынялася наша выступленне з-за дажджу, але гледачы заставаліся на месцы, канцэрт прайшоў з поспехам.

У час нашых канцэртаў было атрымана шмат запісак ад калгаснікаў, якія прасілі выканаць іх любімыя творы. Калі б мы паспрабавалі задаволіць іх, дык не хапіла б і сутак. Многа працы выпала на долю нашых баяністаў Рамана Гана, Генадзія Мандруса і лаўрэата VI Сусветнага фестывалю моладзі Веніяміна Бурковіча. Яны іграл звыш праграмы.

Будучы на Случчыне, аркестр пабываў у гасцях у шахцёраў Салігорска.

У новым шырокаэкранным кінатэатры адбылася творчая сустрэча, якая прайшла пад дэвізам «Нашы падарункі XXII з'езду КПСС». На сцэну ўзняўся калектыў камуністычнай працы, які ўзначальвае тав. Кожухаў. Ён расказаў, што іх участак узяў павышанае абавязацельства. Змена выдае звыш плана 500 — 600 кубаметраў солі і займае першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве.

Мастацкі кіраўнік аркестра І. Жыновіч вітаў рабочых калійнага камбіната. Ён сказаў, што сваё выступленне музыканты прысвячаюць калектыву камуністычнай працы тав. Кожухава.

Выконваючы сацыялістычныя абавязацельствы, узятыя да XXII з'езда КПСС, Дзяржаўны народны аркестр даў адзінаццаць канцэртаў у калгасах Слуцкага, Капыльскага і Старадарожскага раёнаў Мінскай вобласці і восем канцэртаў у калгасах Віцебскага раёна.

М. РУБІНШТЭЙН,
артыст Народнага аркестра.
Фота аўтара.

Цымбаліст В. Бурковіч і баяніст Р. Ган па просьбе калгаснікаў іграюць звыш праграмы.

Другі «ярус».

Пасля канцэрта. Калгаснікі запрашаюць мастацкага кіраўніка аркестра І. Жыновіча прыехаць яшчэ.

ФОРУМ ЗАКОНЧАН

Дзесяць дзён прадстаўнікі моладзі з усіх кантынентаў нашай планеты плённа працавалі ў сталіцы нашай Радзімы — Маскве. На пленарных пасяджэннях форума па важейшых пытаннях галоўнай тэмы—«Моладзь сярэдзіны XX-га стагоддзя і яе праблемы» — было заслухана дванаццаць дакладаў.

Сусветны форум моладзі — яркае пацвярджэнне, што маладое пакаленне — вялізарная сіла, якая здольна забяспечыць сацыяльны прагрэс. Пра гэта сведчылі і дыскусіі, што разгарнуліся на пасяджэннях камісій. Камісіі і падкамісіі дазволілі ўдзельнікам форума больш дэталёва выказацца і супаставіць свае погляды па канкрэтных праблемах і пытаннях.

Шматлікую аўдыторыю збіралі камісіі па праблемах удзелу моладзі ў барацьбе за нацыянальную незалежнасць і нацыянальную рэканструкцыю; па пытаннях барацьбы моладзі за мірнае суіснаванне, узаемаразуменне і супрацоўніцтва; па пытаннях навуковатэхнічнага прагрэсу ў сучасным грамадстве; па праблемах рабочай моладзі, па праблемах дзяцей і рад іншых.

У цэнтры ўвагі маладзёжнай асамблеі знаходзіўся дакумент, які ўсхваляваў усё чалавецтва — праект Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. З'яўленне гэтага гістарычнага дакумента зрабіла ўплыў на выступленні прамоўцаў. Самая аўтарытэтная партыя нашай планеты, партыя камуністаў Савецкага Саюза, цвёрда, на ўвесь голас заявіла, што спрадвечная мара лепшых розумаў чалавецтва — камунізм — стане явай яшчэ ў нашым стагоддзі.

І ці не таму 24-гадовы чэхаславацкі шахцёр, дэпутат Нацыянальнага сходу Чэхаславацкай рэспублікі Аўгусцін Махата назваў праект Праграмы «здзіўляючым дакументам», які асвятляе шлях да светлай будучыні не толькі савецкім людзям, але і ўсім народам.

Сведчаннем усеагульнай цікавасці да праекта Праграмы КПСС з'явілася сустрэча моладзі ў клубе «Форума» ў Цэнтральным Доме літаратараў. З дакладам аб гэтым гістарычным дакументе перад удзельнікамі форума выступіў член савета Міжнароднай сацыялістычнай асацыяцыі, член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР Ю. П. Францаў. Звяртаючыся да пасланцоў юнацтва ўсіх кантынентаў, дакладчык сказаў, што Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза адкрывае шлях у светлае заўтра. З кім жа не гаварыць аб будучыні, калі не з моладдзю.

2-га жніўня моладзь свету пабывала ў Крамлі. Своеасаблівы вынік дыскусій — «Выхаванне моладзі ў сучасным грамадстве» — падвёў у сваім выступленні ганаровы госць форума член Сусветнага Савета Міру паэт Аляксей Суркоў.

Учора Сусветны форум моладзі закончыў сваю работу. Днём у Палаце спорту ў Лужніках адбылося ўрачыстае закрыццё асамблеі юных.

МЕСЯЧНІК БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫКІ

Мінскі гарадскі камітэт камсамола разам з Домам грампласцінкі вырашыў правесці месячнік беларускай музыкі ў грамзапісу. Гэтаму пытанню была прысвечана нарада, якая адбылася днямі ў гаркоме камсамола. У нарадзе прынялі ўдзел работнікі гандлю, Дома грампласцінкі, Беларускага радыё і Міністэрства культуры. Тт. Сіско, Барбараш, Бранавіцкі, Кароль, Сямілетнікаў і іншыя ў сваіх выступленнях унеслі рад прапаноў па правядзенню вечароў музыкі, сустрэч з беларускімі кампазітарамі, праслухоўванню класічных музычных твораў. Было вырашана пачаць месячнік музыкі ў жніўні гэтага года.

АГЛЯД НАРОДНЫХ ТАЛЕНТАЎ

Вялікім поспехам у масквічоў і гасцей сталіцы карыстаецца адкрытая ў Цэнтральнай выставачнай зале Усесаюзная выстаўка работ самадзейных мастакоў. Тут прадстаўлена, звыш пяці тысяч лепшых работ 2.526 аўтараў. На выстаўцы ўдзельнічаюць людзі самых розных прафесій, якія аддаюць свой адпачынак выяўленчаму мастацтву. Іх работы—творы жывапісу, скульптуры, графікі, прыкладнога і дэкаратыўнага мастацтва—вабяць гледачоў сваёй шчырасцю, цеплынёй, пераканальнасцю, веданнем жыцця.

На здымку—наведвальнікі аглядаюць работы мастакоў-аматараў.

Фота Э. Еўзярыхіна. Фотахроніка ТАСС.

З ПАЧЫНАЮЧЫМІ ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ

Калі ў раённай газеце змяшчаюцца літаратурныя старонкі, агляды твораў пачынаючых пісьменнікаў, літаратурныя куткі, паасобныя вершы, апавяданні, фельетоны чытачоў, — гэтага нельга не вітаць.

Але вельмі засмучаюць факты няўважлівага стаўлення работнікаў рэдакцый раённых газет да літаратурных твораў.

Вось некалькі прыкладаў, узятых з раённых газет Міншчыны за гэты год.

«Калгаснік Капыльшчыны» — нумар за 1 красавіка. У вершы М. Макарчука «Голас маці» чытаем:

Сын **загінуў подзвігам героя,**
Калі вораг край наш паланіў.

А перад гэтым, 28 студзеня, у такім жа літаратурным кутку той жа аўтар у вершы «Зімовы вечар» пісаў:

Скрыпяць калодзежы, вароты,
Прыкметны рухі на двары.
Сваёю звычнаю работай
Заняты тут гаспадары.

Канфуз адбываецца ў змешчанай побач байцы «Ліса-прадавец»:

Праз нейкі час лісіца
патлусцела.
Пушысты хвост **паносіла**
трубой
І нават на мядзведзя звысака
глядзела...

Магло, вядома, здарыцца, што М. Макарчук напісаў «хвост падносіла», а газета дапусціла памылку друку. Але чытачу ад гэтага не лягчэй.

Не лепш атрымалася 14 студзеня ў літаратурным кутку і з прозай. У апавяданні У. Куксо «Неспакойны чалавек» галоўны герой, інвалід Айчыннай вайны, не ў выглядзе каламбура, а зусім сур'ёзна гаворыць пра сябе: «Прыйшоў да хаты (трэба «дахаты». — Г. С.) **без нагі**, паставіў ферму **на ногі**, таксама не лёгка».

У старобінскай раённай газеце «Савецкі патрыёт» за 14 студзеня надрукаваны верш А. Кур'яна «Дзявочы смутак». З першага ж радка і да апошняга пакінутая каханым дзяўчына сядзіць у адзіноце і ў горкім роздуме. Прычым, спачатку:

Па-над ракою пахне мятай,
Глядзіцца месяц у ваду.
Пайшлі гуляць **туды** дзяўчаты,
А я нікуды не іду.

У заключнай страфе таксама:

Па-над ракою пахне мятай,
Глядзіцца месяц у ваду.

Аднак

Пайшлі гуляць **туды** дзяўчаты.
Ну, што ж, і я **туды** пайду.

Куды ж. урэшце, рашылася пайсці кінутая дзяўчына і куды пайшлі яе сяброўкі? На раку або... у ваду? І ўвогуле, што можа даць чытачу падобны «дзявочы смутак»?..

Газета «Савецкі патрыёт» у тым жа нумары змясціла за подпісам Ул. Новіка агляд вершаў «У паэзію шлях нялёгкі». Аўтар агляду зусім слушна заўважае: «Нельга ж, папросту кажучы, сяк-так зблытаныя радкі выдаваць за паэзію». Але 30 мая ў гэтай газеце надрукаваны верш таго ж Ул. Новіка «Каралева, мая каралева!» І чым іншым, як не «сяк-так зблытанымі радкамі», з'яўляецца страфа:

Кінеш вокам — квадраты,
квадраты...
Ні канца ім, ні краю няма.
Ураджаем нас дорыш багатым,
Нам з табою не страшна зіма.

Апошняе ж чатырохрадкоўе гучыць так:

Каралева, мая каралева,
З шырокім зялёным лістом.
Разляглася направа-налева
За кожным калгасным сялом.

У вершы ні разу не гаворыцца, што гутарка ідзе пра кукурузу, слова «каралева» ўжыта без двукоссяў і без дапаўнення «палёў». У выніку атрымліваецца зусім не тое, што хацеў сказаць аўтар..

Між іншым, гэты «шэдэўр» Ул. Новіка 11 чэрвеня перадрукавала старадарожская газета «За Савецкую Радзіму».

Слуцкая раённая газета «За сацыялістычную Радзіму» шырока прадастаўляе свае старонкі творчасці чытачоў. За першую палову 1961 г. тут апублікавана 22 вершы і 5 празаічных твораў 19 аўтараў. Трэба прама сказаць, што большую частку іх друкаваць было не варта, каб не ўводзіць чытача ў зман адносна норм беларускай і рускай моваў, а таксама адносна спецыфікі мастацкай літаратуры.

В. Золатава ў нумары газеты ад 21 лютага гаворыць пра зверствы каланізатараў у Конга такімі радкамі:

По-варварски трупы зарыли,
Грехи свои спрятав на миг.
Знамёна склоняя к могиле,
Народ не простит за них.

Несумненна, у дададзеным выпадку было б лепш, каб аўтар гэтых «вершаў» выказала свае пачуцці ў форме звычайнага ліста ў рэдакцыю. Тое ж можна сказаць і пра іншых аўтараў і іх творы.

Магчыма, рэдакцыі разглядаюць друкаванне твораў маладых аўтараў як іх заахвочванне. Супраць гэтага пярэчыць нельга, але ж тады трэба даводзіць творы, якія друкуюцца, да пэўнай, як кажуць, кандыцыі, сістэматычна працаваць з пачынаючымі, перш чым друкаваць іх творы.

Работнікі рэдакцый павінны не забываць, што раённая газета, якая нараджаецца ў самай непасрэднай блізкасці да чытача,— гэта носьбіт высокай культуры, у тым ліку культуры моўнай.

Г. САМСОНАЎ,
літаратурны супрацоўнік крывіцкай раённай газеты «Ленінскі шлях».

Чэхаславацкі эстрадны аркестр, які вы бачыце на здымку, выступае ў памяшканні Мінскага цырка, дзе праходзяць гастролі гэтага калектыву пад кіраўніцтвам Густава Брома. У выступленнях прымаюць удзел Ярміла Весела, Іржы Вашычэк, Магда Вайткова і Алоіз Войтэк.

Гісторыя з „Дзядзькам Антонам"

За апошнія гады беларускае літаратуразнаўства дасягнула значных поспехаў. Аддаючы асноўную ўвагу праблемам сучаснасці, надзённым пытанням літаратуры, нашы даследчыкі шмат зрабілі ў справе вывучэння літаратурнай спадчыны мінулага стагоддзя. Манаграфічныя працы «Францішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя» В. Барысенкі, «Па шляху рэалізму» М. Ларчанкі, «Нарысы беларускай літаратуры XIX стагоддзя» С. Майхровіча і «Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палавіне XIX веку» І. Лушчыцкага, а таксама два зборнікі тэкстаў, падрыхтаваныя Інстытутам літаратуры імя Я. Купалы і выдадзеныя ў 1950 і 1959 гг., пашырылі і ўзбагацілі звесткі пра творчасць паасобных пісьменнікаў і літаратурны працэс гэтага важнага перыяду ў гісторыі развіцця культуры беларускага народа.

Аднак і сёння ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя яшчэ не ўсё даследавана дастаткова поўна і грунтоўна, многія моманты асветлены вельмі павярхоўна і прыблізна, а ў некаторых працах ёсць неабгрунтаваныя і бяздоказныя сцвярджэнні.

Аб гэтым пераканаўча сведчыць гісторыя з аўтарствам ананімнага публіцыстычнага твора «Дзядзька Антон або гутарка аб усім чыста, што баліць, а чаму баліць — не ведаем», які з'явіўся ў канцы XIX стагоддзя (1892). Ананімная гутарка «Дзядзька Антон» — вельмі цікавы твор па свайму зместу і ідэйнай накіраванасці, мастацкіх прыёмах і мове. Гэта сямейны і трапны водгук на грамадска-палітычныя падзеі жыцця, папулярная лекцыя па эканоміцы і ў тойжа час удалае спалучэнне агітацыйнай публіцыстыкі з мастацкай прозай.

Хто аўтар гэтага твора? Пры яніх акалічнасцях з'явілася гутарка за мяжой у падпольнай друкарні? Вось пытанні, якія павінны былі б прыцягнуць пільную ўвагу беларускіх літаратуразнаўцаў і гісторыкаў. На жаль, гэтага чамусьці не атрымалася.

Правільна звязаўшы гісторыю з'яўлення гутаркі «Дзядзька Антон» з вядомым рускім публіцыстычным творам В. Варзара (А. Іванова) «Хітрая механіка або прадзіўны раскал куды ідуць грошы» (Масква, 1874), беларускія даследчыкі спыніліся на паўдарозе і сталі рабіць паспешлівыя вывады: «...Дзядзька Антон» — не просты варыянт «Хітрай механікі», а творчае пераасэсаванне ў здпаведнасці з умовамі жыцця Беларусі, фактаў і думак, выкладзеных у гэтай кнізцы», — піша І. Лушчыцкі ў сваіх «Нарысах па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі» З І. Лушчыцкім пераклікаецца С. Майхровіч: «Нават самы сцісла парафразны тэкставы сталагічны аналіз абодвух «гутарак» пераканаўча даводзіць, што беларускі варыянт значна адрозніваецца ад «Хітрай механікі» і з'яўляецца творам арыгінальнай самостойнай думкі...»

Што датычыць аўтарства «Дзядзькі Антона», дык М. Ларчанка, І. Лушчыцкі і С. Майхровіч услед за Я. Карскім з агаворкамі ці без агаворак лічаць, што гутарка належыць пяру беларускага паэта Адама Гурыновіча. І. Лушчыцкі ў сваёй кнізе сцвярджае: «Вывучэнне творчасці паэта-рэвалюцыянера прывяло нас да цвёрдага пераканання, што сааўтарам і выдаўцом «Дзядзькі Антона» быў імянны Адам Гурыновіч». Калі І. Лушчыцкі лічыць А. Гурыновіча толькі сааўтарам гутаркі, дык С. Майхровіч ідзе яшчэ далей: «...Ананімным аўтарам і выдаўцом «Дзядзькі Антона» ў падпольнай друкарні з'яўляецца сам паэт». («Нарысы беларускай літаратуры XIX стагоддзя»). Такой жа думкі прытрымліваецца і М. Ларчанка ў кнізе «Па шляху рэалізму».

Якімі меркаваннямі кіраваліся беларускія даследчыкі, лічачы А. Гурыновіча аўтарам гутаркі «Дзядзька Антон»? Яны добра выкладзены ў кнізе І. Лушчыцкага: «Стаўночым доказам на карысць таго, што сааўтарам брашуры «Дзядзька Антон» быў ніхто іншы, як А. Гурыновіч, з'яўляецца тое, што ў 90-х гадах XIX стагоддзя нам невядомы ні адзін беларускі пісьменнік, які б дайшоў да такіх глыбокіх рэвалюцыйных і тэарэтычных абагульненняў, да якіх узвысіўся рэвалюцыянер-дэмакрат Адам Гурыновіч». Меркаванні меркаваннямі, а дзе канкрэтныя факты, якія пацвярджаюць гэтую думку? Іх няма! І. Лушчыцкі, М. Ларчанка і С. Майхровіч абапіраюцца і спасылаюцца на аўтарытэтнае сцвярджэнне Я. Карскага («Беларусы», том. III, частка 3, стар. 77). Але чамусьці ніхто з даследчыкаў не звярнуў увагі на тое, што ў кнізе выдатнага беларускага вучонага адносна аўтарства гутаркі ёсць і іншае сцвярджэнне: «Па звестках Р. Зямкевіча выдана ў Тыльзіце літоўцамі. Аўтар Марыян Абрамовіч» (стар. 154).

У некаторых польскіх матэрыялах мне не аднойчы даводзілася сустракаць скупыя звесткі аб тым, што ананімны твор «Дзядзька Антон» сапраўды быў выдадзены ў Тыльзіце польскім рэвалюцыянерам Марыянам Абрамовічам. Больш таго, у кнізе польскага гісторыка Фелікса Перла «Гісторыя сацыялістычнага руху» (Краков, 1910; Варшава, 1932) сцвярджалася, што беларуская гутарка «Дзядзька Антон» — гэта пераклад польскай брашуры «Бацька Шымон».

Пасля працяглых пошукаў мне ўдалося нядаўна, нарэшце, натрапіць на польскую кнігу «Ojciec Szymon. Opowiadanie napisał Tomek Kujawczyk. Wydanie czwarte, poprawione» Лондан, 1896, стар. 23.

«Na samym koncu wsi naszej, tuż pod lasem stoi obszerna chata ze słomianym, poczerniałym od starości dachem, a spytajcie kogo chcecie we wsi: czyja to chałupa, wnet wam odpowie, że to ojca Szymona. Tak tu wszyscy we wsi nazywamy jednego z gospodarzy, bo człek taki poczciwy, taki dobry i szczery dla każdego, jak ojciec prawdziwy, a przytem taki miądry, ze o co go tylko zapytasz, na wszystko da ci odpowiedź; i słowo rozumne powie i każda robotę do ładu doprowadzi» («Ojciec Szymon», 1896, стар. 1).

Беларускі пераклад вельмі блізкі да польскага тэксту, толькі галоўны герой бацька Шымон стаў дзядзькам Антонам: «На самым канцы нашага сяла, аж пад лесам, стаіць, пакасіўшыся, старэнькая хатка; легка даведаццё, чыя яна, спытай толькі каго хочаш, а кожны табе гэта скажа, бо ўкруг усе ведаюць, што там жыве дзядзька Антон. Дзядзькай яго ўсе мы тут празываем, ад старога да малога. Варт ен, таго, бо гэта яшчэ нічога, што ен чалавек добры, справядлівы, для ўсякага шчыры, казаў бы бацька родны, а тое важней, што і разумны ён вельмі: аб чым толькі не папытаўся, усё чыста ён табе так раскажа, што цэла рэч у галаве ясней неяк стане» («Дзядзька Антон», 1892, стар. 1).

Возьмем для параўнання наўгад яшчэ мясціну:

«Oj, bogacze, bogacze! Chyba sumienia wy za grosz nie macie! Zapytaj ty ich, co oni robią? Czy pan kiedy choć jedna morgę pola wyorał? Czy kupiec kiedy sam wyrobił na warsztacie choć jednę sztukę płótna? Wszystko to naszemi chłopskiemi zrobione rękami» (стар. 9).

«Ой, гэтыя багачы, багачы! Ці яны маюць сумленне? Спытай ты іх, што яны робяць каторы? Ці бачыў з вас каторы, каб пан сабе хоць адзін загон узараў? Ці відзел, каб купец каторы сам на варстаце хоць локаць палатна выткаў? Усё зроблена нашымі мужыцкімі рукамі» (стар. 17).

Нічым істотным не адрозніваецца ад польскага тэксту і такі ўрывак:

«Спужаўся цар гэтых бунтаў мужыцкіх; змеркаваў, спахваціўся скора, што, як ён не скіне прыгону, то мужыкі і да яго да бярунца; даў нам вольнасць, и сваім чыноўнікам прыказаў усю ды гаварыць, што ён для нас дабрадзейства зрабіў, што ён гэта зрабіў з ласкі, за сваей даброці, з таго, што ен нас любіць вельмі. Ой любіць ён нас, любіць, аж у нас костачкі з яго літасці трашчаць!» (стар. 28).

«Дзядзька Антон» — мастацкі пераклад «Бацькі Шымона», вельмі блізкі да польскага тэксту. Адступленне ад арыгінала ёсць толькі ў адным выпадку, калі здарэнне з жыцця польскага сялянства з-пад Кельцаў заменена мясцовым прыкладам — расказам пра хваляванне сялян (каля Друі. Зменены таксама з улікам таго, што гутарка адрасуецца беларускаму чытачу, геаграфічныя назвы (Варшава і Лодзь — на Вільню), некаторыя імёны (Шымон на Антон, каморнік Блажэй названы Вінцэсем-кутнікам, а ў другім месцы — старым Базылём).

Акрамя таго, польскі эпіграф «Калі б конь пра сваю сілу ведаў, ні адзін сядок на ім бы не ўседзеў» заменены беларускай прыказкай «Загляне сонца і ў наша аконца». Няма ў польскім тэксце баявога закліку, якім заканчваецца беларускае выданне: «А цяпер—проці ў цара і яго чыноўнікаў пойдзем!»

Цяпер крыху пра гісторыю з'яўлення польскага публіцыстычнага твора «Бацька Шымон» і беларускага перакладу «Дзядзька Антон».

На падставе польскіх крыніц і асабліва цікавай кнігі Ж. Корман «Матэрыялы да бібліяграфіі сацыялістычных выданняў у 1866—1918 гг.» (Варшава, 1935) можна пакуль што даць такія звесткі. У 1878 г. у Варшаўскай падпольнай друкарні з'явіліся на польскай мове ананімныя кнігі «Цікавая гісторыя» і «Апавяданне старога гаспадара» — апрацоўка рускай брашуры «Хітрая механіка» Зубко Кадрэану (відаць, другі псеўданім В. Варзара). Аўтарам гэтай першай апрацоўкі «Хітрай механікі» некаторыя даследчыкі лічаць Шымона Дыкштэйна (1859—1884) — польскага сацыяліста і вучонага-прыродазнаўца, які пад псеўданімам Ян Млот выдаў кнігу «Хто з чаго жыве» і пераклаў на польскую мову творы Энгельса, Ласаля і Дарвіна. Пасля ананімныя творы «Цікавая гісторыя» і «Апавяданне старога гаспадара» шэсць разоў выдаваліся ў Польшчы і за мяжой як апавяданне Томэка Куяўчыка пад назвай «Бацька Шымон» («Варшава, 1882; Жэнева, 1883; Варшава, 1891; Лондан, 1896 і 1902; Кракаў, 1910).

Першае беларускае выданне «Бацькі Шымона» — «Дзядзька Антон» з'явілася ў 1892 г. Узнікае пытанне: дзе і кім была выдадзена гэтая кніга, хто быў яе перакладчыкам на беларускую мову? На тытульнай старонцы гутаркі ёсць такія выходныя даныя: «Вільна. У друкарні Марыі Красоўскай. 1892». Але такой друкарні ні ў Вільні, ні ў іншым горадзе не існавала. Як сведчаць польскія матэрыялы, «Дзядзька Антон» выдадзены на самай справе ў Тыльзіце і выдаўцом яе быў Марыян Абрамовіч (Ф. Перл. «Гісторыя сацыялістычнага руху»; «Пшэглёнд віленскі», 1925 № 1; «Польскі слоўнік біяграфічны», том 1).

Другое выданне «Бацькі Шымона» з'явілася на беларускай мове пад назвай «Гутарка аб тым, куды мужыцкія грошы ідуць» (Лондан, 1903) і бліжэй звязана з польскім тэкстам «Бацькі Шымона», які з'явіўся таксама ў Лондане на год раней беларускага выдання (справа ў тым, што ў польскім выданні 1902 г. дзеянне перанесена з карчмы ў хату Шымона). Знаёмства з выданнем 1903 г. пераконвае, што гэта новы пераклад «Бацькі Шымона» на беларускую мову, зроблены іншым перакладчыкам. Пераклад гэты таксама блізкі да польскага арыгінала, але паміж тэкстам «Гутаркі аб тым, куды мужыцкія грошы ідуць» і «Дзядзькам Антонам» ёсць значныя адрозненні ў лексіцы, сінтаксічнай пабудове сказаў. Апрача таго, ў лонданскім выданні 1903 г. галоўны герой названы Сымонам, стары Блажэй — Яськам і інш.

Цяпер трэба адказаць на пытанне: ці меў якое-небудзь дачыненне да першага выдання і перакладу «Дзядзькі Антона» беларускі паэт Адам Гурыновіч? Мне здаецца, што не меў. Праўда, з архіўных матэрыялаў пра рэвалюцыйную дзейнасць А. Гурыновіча, якія апублікаваны ў кнізе «Беларуская літаратура. Даследаванні і публікацыі» (том 1, Мінск, 1958) відаць, што беларускі паэт чытаў «Бацьку Шымона». Больш таго, у часе вобыску ў беларускага паэта сярод іншай нелегальнай літаратуры — твораў К. Маркса, Ф. Энгельса, Ф. Ласаля былі знойдзены чатыры экземпляры «Бацькі Шымона» на **польскай мове.** Гэты факт яшчэ нічога не гаворыць аб тым, што менавіта А. Гурыновіч быў перакладчыкам польскай брашуры на беларускую мову, бо «Бацька Шымон» і другі твор Ш. Дыкштэйна «Хто з чаго жыве?» былі вельмі папулярныя і знаходзіліся ў бібліятэцы кожнага перадавога грамадскага дзеяча. На маю думку, А. Гурыновіч не ведаў нават аб беларускім выданні «Бацькі Шымона». У спіс разнастайнай нелегальнай літаратуры, якая была выдадзена за мяжой на розных мовах і якую меркавалася атрымаць для студэнцкага гуртка, ён дапісаў толькі дзве кнігі на беларускай мове: «Дудку беларускую» Ф. Багушэвіча і «Пра багацтва ды беднасць» Падалінскага. Шкада, што мы не ведаем зместу васьмі спыткаў рукапісаў А. Гурыновіча, якія былі забраны ў яго пры вобыску. З перапіскі дэпартамента паліцыі і Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення вядома толькі, што ўсе восем спыткаў напісаны на беларускай мове, а ў спытку № 1 былі «змешчаны артыкулы яўна рэвалюцыйнага зместу». Гэтыя матэрыялы А. Гурыновіча, магчыма б, праяснілі пытанне, ці меў паэт якое-небудзь дачыненне да перакладу «Дзядзькі Антона».

А пакуль што на аснове артыкулаў і ўспамінаў пра М. Абрамовіча можна меркаваць, што ён сам ці пры дапамозе нейкага іншага знаўцы беларускай мовы зрабіў пераклад «Бацькі Шымона». Марыян Абрамовіч (1871—1925) — польскі сацыяліст, чалавек цікавай біяграфіі — нарадзіўся ў Цверы, вучыўся ў гімназіі і універсітэце ў Маскве, некалькі разоў нелегальна пераходзіў граніцу, выдаваў кнігі на польскай мове за мяжой, сядзеў у Пецярбургскай турме, быў ссыльным у Верхаянску. Цікава адзначыць той факт, што выдаўца «Дзядзькі Антона» некаторы час жыў на Навагрудчыне, быў шчырым сябрам вядомага этнографа М. Федаровіча, добра ведаў беларускую мову. «Яшчэ будучы студэнтам вывучаў літоўскую і беларускую мовы, заўсёды падтрымліваў імкненні літоўскіх і беларускіх патрыётаў», — пісаў польскі часопіс «Пшэглёнд віленскі» (1925, № 1) у сувязі са смерцю М. Абрамовіча.

Хто б там ні быў выдаўцом і перакладчыкам гутаркі, але факт застаецца фактам: «Дзядзька Антон» — твор перакладны, і няма ніякіх падстаў прыпісваць яго аўтарства А. Гурыновічу і толькі на гэтай аснове рабіць вывады аб светапоглядзе беларускага паэта. На маю думку, архіўныя матэрыялы пра грамадскую дзейнасць А. Гурыновіча, сярод якіх ёсць пратаколы допыту па справе нелегальнага студэнцкага Гуртка моладзі польска-літоўскай, беларускай і маларускай, старшынёю якога быў беларускі паэт, дае дастатковае звестак, каб без дамыслу ўявіць сабе воблік рэвалюцыйнага дэмакрата А. Гурыновіча.

Далей. «Бацька Шымон» — польская апрацоўка Ш. Дыкштэйнам гутаркі рускага публіцыста В. Варзара—зближае дыстанцыю паміж «Хітрай механікай» і «Дзядзькам Антонам». «Дзядзька Антон» — яркае сведчанне цесных руска-польска-беларускіх грамадскіх і літаратурных сувязей у другой палове XIX стагоддзя, якія чакаюць свайго даследчыка.

* * *

Погляд на гутарку «Дзядзька Антон» як на твор арыгінальнай думкі, домысел, што аўтарам яго з'яўляецца А. Гурыновіч, — сведчанне таго, што многія старонкі беларускай літаратуры XIX стагоддзя як належыць яшчэ не даследаваны. Трэба ўлічваць тую акалічнасць, што ў мінулым стагоддзі па сутнасці не было беларускага перыядычнага друку і многія беларускія пісьменнікі супрацоўнічалі ў рускіх і польскіх газетах і часопісах. Дэталёвае знаёмства з усімі перыядычнымі выданнямі на рускай і польскай мовах, якія мелі дачыненне да Беларусі і змяшчалі матэрыялы пра жыццё беларускага народа, дасць многа цікавых і нават неспадзяваных звестак пра жыццё і творчасць некаторых пісьменнікаў. Трэба таксама заняцца пошукамі новых матэрыялаў у архівах Масквы, Ленінграда, Кіева, Львова, Вільнюса, Варшавы, Кракава. Вядома, пошукі архіўных матэрыялаў — справа нялёгкая і марудная, але вынікі яе, бясспрэчна, акупяць усе выдаткі.

Для пацвярджэння сваёй думкі прывяду такі факт. Зусім нядаўна лічылася, што ўсе матэрыялы пра жыццё і творчасць Ф. Багушэвіча «вычарпаны» даследчыкамі і больш нічога, нягледзячы на ўсе намаганні, нельга знайсці. А вось толькі за два апошнія гады выяўлены вельмі цікавыя і важныя матэрыялы пра жыццё і творчасць аўтара «Дудкі беларускай»: чатыры пісьмы Ф. Багушэвіча да польскай пісьменніцы Э. Ажэшкі, апавяданне «Траляляначкі», выдаўленае ананімна ў Кракаве ў 1892 г., некралогі і артыкулы ў польскім друку, якія ўдакладняюць месца нараджэння беларускага паэта, пацвярджаюць факт удзелу яго ў паўстанні 1863 г., раскрываюць невядомыя псеўданімы і новую старонку творчай дзейнасці пісьменніка — супрацоўніцтва ў польскім часопісе «Край» і г. д. Г. Кісялёў, які ў мінулым годзе надрукаваў у часопісе «Полымя» (№ 10) змястоўны артыкул пра гімназічныя і студэнцкія гады Ф. Багушэвіча, выявіў цікавейшы матэрыял — 60 лістоў паэта да польскага філолага Яна Карловіча.

Загадчык рукапіснага аддзела бібліятэкі АН Літоўскай ССР тав. У. Абрамовіч днямі пазнаёміў аўтара гэтага артыкула з трыма лістамі Ф. Багушэвіча да польскага журналіста Адама Карловіча, якія патрацоўца кастрычнікам-снежнем 1899 г. Удалося мне таксама нядаўна натрапіць у Цэнтральным гістарычным архіве Літоўскай ССР на вельмі цікавы дакумент, які яшчэ раз пацвярджае, што аўтарам «Траляляначкі» з'яўляецца Ф. Багушэвіч. У фондах архіва захоўваецца адрасаваная Яну Карловічу адносіна з друкарні Анчыца ад 22 жніўня 1893 г., у якой ёсць такое месца: «Таксама напамінаем Вам аб рахунку аўтара «Траляляначкі» (адваката з Вільні), які нам напісаў, што яго рахунак уладкуе шаноўны пан» (г. зн. Я. Карловіч. — **С. А.**)

Гэта, вядома, яшчэ не ўсё. Ёсць надзея, што ў хуткім часе будзе адшуканы асабісты архіў Ф. Багушэвіча і кнігі з бібліятэкі паэта з яго заўвагамі і паметкамі.

Такое становішча не толькі з матэрыяламі пра Ф. Багушэвіча. У аўтара гэтага артыкула ёсць звесткі, што ў архівах Польшчы захоўваюцца невядомыя беларускаму літаратуразнаўству матэрыялы пра творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча і Я. Лучыны.

Дэталёвае вывучэнне беларуска-рускіх і беларуска-польскіх літаратурных сувязей ў XIX стагоддзі, складанне бібліяграфіі матэрыялаў пра беларускую літаратуру і фальклор, якія змешчаны былі ў перыядычным друку славянскіх народаў, старанны і сістэматычны архіўныя пошукі дазволяць грунтоўна даследаваць шляхі развіцця айчыннай літаратуры ў мінулым стагоддзі.

С. АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Падзеі, факты, навіны

«МЕФЕЦІТ СЛУЦК»

Слуцкі пояс... Колькі легенд, паданняў і казак склалі пра тых, хто два стагоддзі назад пры курнай лучыне ткаў залатыя паясы. Даўно ўжо няма тых цудоўных прыгонных майстроў, чые рукі стваралі такое высокае мастацтва. Цяпер пра іх нагадваюць толькі паясы, якія калісьці развезлі па ўсяму свету ўладары вядомага слуцкага замка Радзівіла. Слуцкія паясы захоўваюцца ў Лонданскім дзяржаўным музеі, у французскім музеі мастацтва, у амерыканскім нацыянальным музеі, у музеях нашай краіны. Амаль на кожным з іх у куточку майстры выткалі па латыні словы: «Мефеціт Слуцк» — мяне зрабіў Слуцк...

Такі пояс доўгі час шукалі навуковыя супрацоўнікі арггрупы Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея. Неяк стала вядома, што адзін са слуцкіх паясоў захоўваецца ў Чарнігаўскім дзяржаўным музеі. На Украіну паслалі ліст. Хутка прыйшоў адказ. А некалькі дзён назад — невялічкая пасылка. У ёй каштоўны падарунак: слуцкі пояс. Не верыцца, што зрабілі яго беларускія ткачы 200 год назад. Ён ляжыць на стале зусім новы, сатканы пяшчотнымі бледна-ружовымі фарбамі. Нібыта агеньчыкі, свецяцца ў пялёстках залатыя ніткі.

Так у музеі з'явіўся яшчэ адзін дакумент, які з'яўляецца жывым сведкам высокага майстэрства беларускіх ткачоў.

Музей атрымаў яшчэ некалькі каштоўных экспанатаў. Гэта куфелі выробленыя беларускімі ўмельцамі ў XVII—XVIII стагоддзях. Вось адзін іх, самы маленькі, з цудоўнай ажурнай разьбой і гравіроўкай. На куфелі надпіс на стараславянскай мове: «Сию чашу соорудил Филипп и Андрей Пупы мещане Задавыд-городецкие...» і дата — 1770 год. Калі меркаваць па карунках, Давыд-Гарадоцкія майстры Філіп і Андрэй Пупы, былі разбяры высокай кваліфікацыі і ўмельства.

З Давыд-Гарадка прывезены так званыя царскія вароты (разьба па дрэву) з іканастасамі, зробленымі невядомымі майстрамі жывапісу. Частка іх адносіцца да XVIII стагоддзя, другая частка больш пазнейшага перыяду і, відаць, была выраблена ў XVII стагоддзі. Малюнкі іканастаса, зробленыя раней, захаваліся, і па іх можна меркаваць аб беларускім жывапісу таго часу. Ёсць падставы сцвярджаць, што зроблены яны мясцовымі мастакамі.

Вось яшчэ адзін вельмі цікавы экспанат, дасланы музею, — невялічкая чаша для мыцця рук. На чашы вельмі тонкія, сціплыя карункі. Яны здзіўляюць сваёй чысцінёй апрацоўкі. Можа таму некаторыя навуковыя супрацоўнікі меркавалі, што для вырабу чашы быў ужыты штамп. Але пры больш уважлівым разглядзе не цяжка заўважыць, што захаваліся сляды разца, — невялічкія драпіны. Мяркуюць, што чашай карысталіся ў XVII стагоддзі на Случчыне і належала яна Радзівілам.

— Дзівоснае майстэрства, — гаворыць навуковы супрацоўнік музея Г. Самсонаў.

Старажытныя куфелі і чашы, набытыя музеем.

САМАДЗЕЙНЫЯ КІНАСТУДЫІ

З кожным годам у нашай рэспубліцы пашыраецца лік самадзейных майстроў кінамастацтва. У гарадах, раённых цэнтрах часта можна сустрэць чалавека з кінакамерай. Але стварыць фільм аднаму чалавеку цяжка. Таму аматары аб'ядноўваюцца ў самадзейныя кінастудыі.

Адна з такіх студый была створана нядаўна пры Мінскім гарадскім Доме народнай творчасці. У яе ўвайшлі інжынер-будаўнік М. Смольскі, кантралёр трамвайна-тралейбуснага парка В. Андросаў, супрацоўнік Белдзяржпраекта М. Васькоўч, інжынер навукова-даследчага інстытута мікрабіялогіі А. Грыбаў. Ахвотна згадзіўся прымаць удзел у рабоце аматарскай студыі кінааператар Беларускай студыі хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных фільмаў В. Цясюк.

Студыйцы вырашылі стварыць фільм пра сталіцу рэспублікі і не жыхароў. У бліжэйшы час кінааматары распрацуюць сцэнарый і пачнуць здымкі.

Плённа працуюць над стварэннем фільмаў аматары студый. Інстытута будаўніцтва і архітэкту